ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №11 (87)
(лістапад)

www.lit-bel.org www.novychas.info

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»

Анонс

СЯБРЫНА

«САЛІДАРНАСЦЬ — АДНА З НАШЫХ ГАЛОЎНЫХ МЭТАЎ»

Шэраг літаратурных беларуска-шведскіх стасункаў папоўніўся і ўзбагаціўся яшчэ адной падзеяй: прыездам у Мінск старшыні Саюза пісьменнікаў Швецыі Гунара Ардэліуса і дзіцячай пісьменніцы Эвы Суса, кніга «Снежны чалавек» якой сёлета пабачыла свет па-беларуску.



Гунар Ардэліус



Фота А. Казловай

Эва Суса

Для спадара Гунара візіт у Беларусь — першы. А вось спадарыня Эва была ў Мінску ў 2009 годзе — як і гэтым разам, на падвядзенні вынікаў літаратурнага конкурса на лепшы твор для дзяцей, праведзенага Саюзам беларускіх пісьменнікаў.

Госці прысутнічалі на цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў Конкурса «Exlibris» імя Янкі Маўра, правялі майстар-клас, узялі ўдзел у шэрагу прэзентацыяў і сустрэч.

Пісьменніца **Алена Масла** сустрэлася са шведскімі калегамі незадоўга да ад'езду гасцей.

— Хацелася б напачатку азначыць тэмы, актуальныя і для беларускай, і для шведскай літаратурнай прасторы; пагаварыць пра тое, што нас збліжае і што розніць…

Звернемся да прыкладу зоркі і шведскай, і сусветнай дзіцячай літаратуры — Астрыд Ліндгрэн. Вядомы выпадак, калі сваёй сатырычнай казкай «Памперыпоса з Манісманіі» пісьменніца змяніла сістэму падаткаабкладання ў Швецыі. Скажыце, да гэтай пары голас пісьменніка такі важкі ў Швецыі, што можа ўплываць на ход дзяржаўных спраў, ці ад часоў Астрыд Ліндгрэн нешта змянілася?

Эва Суса: — О, прыклад Астрыд Ліндгрэн асаблівы, унікальны ў сваім родзе. Рэдка сустрэнеш творчую асобу, якая мае адназначнае стаўленне да сябе з боку грамадскасці. Адны любяць і ўспрымаюць чалавека, іншыя — недалюблівають і крытыкуюць. Астрыд жа любілі ўсе! Хаця — не, улады ўсё ж недалюблівалі, бо яна сапраўды стварала ім нязручнасці. Учынкі, прамовы, заўвагі пісьменніцы шырока абмяркоўваліся ў грамадстве, яна была надзвычай папулярнай. Згаданы вамі выпадак сапраўды меў велізарнае значэнне для ўладкавання грамадскага жыцця ў Швецыі, але, бадай, такі магутны пісьменніцкі голас, які быў у Астрыд Ліндгрэн — гэта ўсё ж такі выключэнне.

Гунар Ардэліус: — Калі некаторы час таму да пісьменнікаў грамадства прыслухоўвалася больш уважліва, то сёння літаратура ўжо не мае таго высокага статусу, як раней. Літаратура канкуруе з многімі іншымі формамі забаўляльных відаў мастацтва. Хаця ў апошнія гады ёсць, можна сказаць, прагрэс у літаратуры, калі мець на ўвазе яе камерцыйную вартасць. Паэзія, якасная перакладная літаратура апошнім часам трошкі прыцясняліся, а цяпер назіраецца адраджэнне цікавасці да гэтых жанраў. У той жа час роля пісьменніка ў медыясферы ўзрасла. Быць аўтарам — значыць быць вядомай асобай і пастаянна з'яўляцца ў СМІ. Пісьменніка мы часцей бачым і чуем, але ў цэлым яго вага ў грамадстве, безумоўна, зменшылася.

Э.С.: — У той жа час у грамадстве ёсць важкія галасы, якія належаць менавіта пісьменнікам. Творца стаў больш універсальным і змог перайначыць сваю дзейнасць на больш камерцыйную, бо — куды падзенешся — трэба выжываць. І часта літаратар займаецца не толькі сваёй пісьменніцкай дзейнасцю, але і, напрыклад, журналісцкай. Пісьменнікі вельмі змяніліся ў апошні час. Значна ўзрасла канкурэнцыя, бо шмат аўтараў выдае кнігі. На дадзены момант кнігу ў нас выдаць прасцей, лягчэй і танней, таму нас стала больш.

— У Саюзе пісьменнікаў Швецыі тры тысячы літаратараў. Якія яго функцыі? Творцы «вольныя» і тыя, што належаць да Саюза пісьменнікаў — ёсць паміж імі розніца?

Г.А.: — Добрае пытанне. Мы ўвесь час працуем над тым, каб заахвоціць як мага большую колькасць пісьменнікаў быць сябрамі Саюза. Мы лічым, што мы мацнейшыя, калі нас больш. І таксама стараемся, каб маладыя пісьменнікі як мага раней сталі нашымі сябрамі. Безумоўна, пісьменнікі розныя, як маладыя, так і сталыя. Напрыклад, ёсць аўтары дэтэктываў, якія сваёй творчасцю зарабілі мільёны. Але мы ў сваёй дзейнасці шмат увагі надаем салідарнасці. Аўтары, якія з'яўляюцца сябрамі Саюза пісьменнікаў, атрымліваюць бясплатна юрыдычныя кансультацыі, маюць магчымасць удзельнічаць у стыпендыях СП, наведваць Дамы творчасці, жыць у іх і тварыць — ну і таксама ёсць шмат іншых выгодаў…

Чым мацнейшая наша салідарнасць, тым лепш будзе наладжанае супрацоўніцтва з нашымі контрагентамі — напрыклад, з выдавецтвамі. Калі малады пісьменнік, які мае не шмат выдадзеных кніг, уступае ў сувязь з выдавецтвам, то з дапамогай Саюза пісьменнікаў ён атрымлівае роўныя з іншымі магчымасці і ўмовы. Насамрэч, чым лепш мы ведаем адно аднаго, чым больш дапамагаем адно аднаму, тым мы мацнейшыя. З намі лічацца ў грамадстве, а таксама і дзяржава.

Насамрэч, Саюз пісьменнікаў Швецыі мае на мэце павышэнне салідарнасці, бо пісьменнік — асоба індывідуалістычная, моцная. Дзякуючы гэтым рысам чалавек і можа стварыць нешта вартае. Але ж такія людзі звычайна з падазрэннем ставяцца да калегаў, канкурэнцыя таксама моцная. А наша задача — аб'ядноўваць і ствараць нармальныя ўмовы для працы. Салідарнасць — адна з нашых галоўных мэтаў.

Э.С.: — Я б яшчэ хацела адзначыць, што Саюз пісьменнікаў мае дэмакратычную структуру. У нас адбываецца агульны сход, на якім можа прысутнічаць кожны з сяброў і паўплываць на будучыню арганізацыі. Шляхам галасавання выбіраецца старшыня, праўленне Саюза пісьменнікаў. Гэта бывае раз на год. Ну і далей ужо яны павінны давяраць сваім лідарам…

Г.А.: — Як старшыня Саюза пісьменнікаў я вельмі шмат працаваў над тым, каб структура арганізацыі стала менш іерархічнай, каб кожны мог на аднолькавым узроўні паўплываць на рашэнні.

— Спадарыня Эва, як сябар секцыі дзіцячай літаратуры — ці задаволены вы працай Саюза ў галіне дзіцячай літаратуры?

Э.С.: — Безумоўна, гэта пастаянная спрэчка паміж рознымі групоўкамі: каму ў нашым Саюзе надаецца больш увагі. І таму важна, каб перакладчыкі, аўтары факталагічнай літаратуры не адчувалі сябе ўбаку ад таго, што адбываецца. Пагэтаму ад кожнай групы павінен быць прадстаўнік у праўленні. Напрыклад, калі я была намеснікам старшыні Саюза, я ўвесь час скіроўвала сваю ўвагу на дзіцячую літаратуру, каб на яе не забываліся. Гэтаксама дзейнічаюць і прадстаўнікі іншых секцыяў.

Г.А.: — Да 70-х гадоў у нас было чатыры розныя пісьменніцкія арганізацыі: дзіцячых пісьменнікаў, перакладной літаратуры, факталагічнай літаратуры, а таксама ўласна паэтаў і празаікаў. Але ў сямідзясятых гадах мы аб'ядналіся, і гэта робіць нашую арганізацыю шматколькаснай і моцнай. Ёсць, безумоўна, праз гэта свае цяжкасці ў кіраванні, але разам з тым мы — грамадская сіла. Моцная ў перамовах з выдавецтвамі і прадстаўнікамі ўладаў.

— Ці не падаецца вам, што вага дзіцячага пісьменніка, тым не менш, застаецца значнай у грамадстве заўжды, бо ён працуе з дзіцячай свядомасцю.

Э.С.: — Сапраўды, у гэтым выпадку я б не сказала, што роля шведскага дзіцячага пісьменніка змянілася, яна ўвесь час была вельмі значнай, і мы працягваем адчуваць, што дзіцячы пісьменнік — гэта важна. Дзіцячыя пісьменнікі атрымліваюць шмат увагі, у нас ёсць Акадэмія дзіцячых пісьменнікаў — я таксама была яе сябрам. Ёсць прэмія Астрыд Ліндгрэн — можна сказаць, аналаг Нобелеўскай прэміі ў дзіцячай літаратуры (і ў грашовым эквіваленце), якая даецца за лепшыя творы аўтараў з усяго свету. Таму, безумоўна, нашыя пазіцыі і цяпер моцныя — як гэта і было ўвесь час.


— Спадар Гунар упершыню ў Беларусі. Якія адкрыцці-неспадзяванкі, што вы бачылі па-іншаму?

Г.А.: — Па-першае, шчыра дзякую за магчымасць сустрэцца з беларускімі калегамі і пагаварыць пра іх творчасць, праблемы. З іншага боку, я разумею, што мы ў Швецыі жывем у зусім іншых умовах, якія тычацца пісьменніцтва і пісьменніка. У шведскім грамадстве шмат што наладжана з таго, што не наладжана тут і што аўтаматычна становіцца задачай пісьменнікаў. Гэта вельмі складана. Я разумею, што мы жывем у двух розных светах.

Працяг на стар. 19 (11) ▸

ПАЛІЦА

ВУШАЦКІ СЛОВАЗБОР РЫГОРА БАРАДУЛІНА




Пабачыў свет «Вушацкі словазбор» Рыгора Барадуліна. Гэтае выданне стала 47 выпускам серыі «Кнігарня пісьменніка» Бібліятэкі Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Прадмову да кнігі напісаў Уладзімір Някляеў, фрагменты з яе публікаваліся ў часопісе «Дзеяслоў» і ў «Новым часе». Укладальнікам выдання стала Наталля Давыдзенка, рэцэнзентам — Кастусь Цвірка.

««Вушацкі словазбор» — спроба сабраць за адным бяседным сталом хоць крышачку непераўзыдзенага шматгалосся роднае мне зямлі, шматгалосся, якое, на жаль, пачынае глухнуць», — піша Рыгор Іванавіч ва ўступным слове да кнігі, прысвечанай «Светлае памяці мамы Куліны».

Нездарма на вокладцы змешчанае фота беларускай вёскі. Народны паэт склаў не проста слоўнік адметнай лексікі Вушаччыны — ён імкнуўся перадаць «паганскія карані і біблейскае неба», «чысціню бачання свету», галасы «мамы Куліны, крэўных і блізкіх».

БРАМА: ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ АЛЬМАНАХ



Пабачыў свет першы нумар літаратурна-мастацкага альманаха «Брама». Гэта выданне Магілёўскага абласнога аддзялення ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» (свае альманахі маюць таксама Гродзенскае («Новы Замак») і Брэсцкае («Жырандоля») абласныя аддзяленні СБП, гомельскія літаратары таксама рыхтуюць першы выпуск свайго выдання).

У першым выпуску альманаха «Брама» змешчаныя паэзія, проза, драматургія, а таксама пераклады і літаратуразнаўчыя артыкулы, успаміны і эсэ, прысвечаныя жыццю і творчасці Сяргея Грахоўскага, Аляксея Пысіна, Міхася Ларчанкі, Рыгора Бярозкіна, Яўгеніі Янішчыц, Янкі Сіпакова. Усяго на старонках «Брамы» апублікаваныя матэрыялы 27 аўтараў.

Прэс-служба ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў»

ДЗВЕРЫ Ў «ВУСЦІШНЫ ПАКОЙ»



Адчуванне хісткасці рэчаіснасці, трывожная і заваблівая прысутнасць чагосьці тагасветнага напаткае кожнага, хто зазірне ў «Вусцішны пакой». Так называецца новы зборнік містычнага і гатычнага апавядання ад часопіса «ПрайдзіСвет».

Кніга, у якую ўвайшлі 29 вусцішных апавяданняў у перакладзе на беларускую з англійскай, французскай, нямецкай, партугальскай, украінскай, польскай і шведскай моваў, выйшла ў серыях Бібліятэкі Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка» і Бібліятэкі часопіса «ПрайдзіСвет» «PostScriptum». Для перакладу былі абраныя як класікі гатычнага жанру, такія, як Эдгар Алан По і Жэрар дэ Нэрваль, так і, напрыклад, як наш сучаснік Юрый Вінічук.

Кацярына Мацісўская, рэдактар зборніка, расказала, якія з апавяданняў уразілі яе найбольш:

«Мой фаварыт — апавяданне «Энох Сомс» англійскага пісьменніка і мастака-карыкатурыста Макса Бірбама (пераклад Юлі Цімафеевай), якое Борхес уключыў у сваю Анталогію фантастычнай літаратуры. А ў плане мовы ўражвае «Ян Таемнік» Баляслава Лесьмяна (пераклад Ганны Янкута), які найперш застаўся як паэт. Пры слабаватых сюжэтах Лесьмян робіць з мовай нешта неверагоднае, можна цытаваць з любога абзаца і проста атрымліваць асалоду. Яшчэ адзін мой улюбёны аўтар у зборніку — Мантэгю Родс Джэймс, якога хутчэй за ўсё добра ведаюць аматары гатычнага апавядання і які выдатна ўмее ствараць атмасферу жаху. У зборнік увайшлі два апавяданні гэтага аўтара: «Студня Стогнаў» у перакладзе Веры Бурлак і «Нататкі каноніка Альберыка» ў перакладзе Лаўрэна Юрагі».

Апавяданні з «Вусцішнага пакоя» маюць розную напругу — некаторыя нагнятаюць жах і здольныя змусіць кроў стынуць у жылах, а ў некаторых аўтары іранізуюць і кпяць з самой готыкі. Але адчуванне лёгкай ірэальнасці, хуткага прывіднага ценю, скразняку з тагасветнасці не пакіне да апошняй старонкі.

Аляксандра Дорская, budzma.org

СНЕЖАНЬСКІЯ ЮБІЛЯРЫ

У наступным месяцы адзначаюць юбілеі сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў:



07.12.1928 — Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі
12.12.1968 — Усевалад Міхайлавіч Гарачка
19.12.1938 — Валерый Васільевіч Стралко
21.12.1938 — Арнольд Львовіч Каштанаў (Энштэйн)
26.12.1938 — Барыс Міхайлавіч Казанаў (Лапіцкі)

Жадаем усім радасці, натхнення і дабрабыту!

ЛІТСАЮЗ

МАГІЛЁЎ — СМАЛЕНСК

На чарговым паседжанні Магілёўскага абласнога аддзялення СБП сябры пісьменніцкай суполкі хвілінай маўчання ўшанавалі памяць выдатнага навукоўца, найстарэйшага географа Беларусі і СНД, ганаровага старшыні Магілёўскага абласнога аддзела геаграфічнага таварыства, дацэнта Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова, аўтара падручнікаў і дапаможнікаў па геаграфіі Пятра Аляксеевіча Лярскага.


Фота Марыны Чапурных

Мікола Яцкоў уручае альманах «Брама» Віктару Смірнову

Старшыня аддзялення Мікола Яцкоў зрабіў справаздачу за мінулы перыяд і адзначыў, што галоўнай падзеяй жыцця пісьменніцкай суполкі з'явіўся выхад у свет літаратурнага альманаха «Брама». Гэта і пэўны вынік працы сябраў аддзялення, і магчымасць для магілёўскіх літаратараў, якія не ўваходзяць у склад ГА «СБП», паказаць свае творчыя набыткі. (Прэзентацыя альманаха адбылася ў Магілёве 13 лістапада.)

Старшыня рэдакцыйнай рады «Брамы» Яраслаў Клімуць адзначыў, што праца рады працягваецца — і пачалася падрыхтоўка другога выпуска альманаха. Пісьменнік Фелікс Шкірманкоў праінфармаваў аб сваім удзеле ў мерапрыемствах, якія ладзіліся ў Слаўгарадскім раёне. Кіраўнік Магілёўскага літаратурнага клуба «Святліца» пісьменніца Тамара Аўсяннікава расказала, што да выдання рыхтуецца другі паэтычны зборнік удзельнікаў клуба.

У Смаленску адбылася сустрэча прадстаўнікоў Саюза пісьменнікаў Расіі з прадстаўнікамі беларускіх грамадскіх арганізацый. У сустрэчы ўзялі ўдзел сакратар Саюза пісьменнікаў Расіі (СПР) Алег Дарагань, старшыня праўлення Смаленскай абласной арганізацыі СПР Віктар Смірноў, сакратар праўлення Смаленскай абласной арганізацыі СПР Галіна Нікалаенкава, смаленскія пісьменнікі Мікалай Чапурных, Вольга Сяргеева, Вера Суханава, старшыня Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў Мікола Яцкоў, старшыня Рускага культурна-асветніцкага таварыства (Магілёў) Людміла Валодзька, пісьменнік з Магілёўшчыны Алесь Казека.

Былі абмеркаваны пытанні сумеснай падрыхтоўкі да «Сіманаўскіх чытанняў», якія традыцыйна адбудуцца ў Магілёве ў лістападзе.

Госці былі праінфармаваны аб адносінах паміж двума смаленскімі творчымі арганізацыямі: Саюзам пісьменнікаў Расіі і Саюзам расійскіх пісьменнікаў. Было адзначана, што стасункі паміж імі знаходзяцца ў рэчышчы добрасуседства, узаемнага паразумення і вызначаюцца супольнай працай. Да таго ж расійская дзяржава выдаткоўвае значныя фінансавыя сродкі на ўтрыманне офісаў абодвух творчых саюзаў і на выданне іх друкаванай прадукцыі. У сваю чаргу, смаленскія пісьменнікі даведаліся аб тым, якія працэсы адбываюцца ў Беларусі ў дачыненнях дзяржавы да двух існуючых пісьменніцкіх саюзаў і аб тым, як гэтыя грамадскія аб'яднанні будуюць адносіны паміж сабой.

У ходзе сустрэчы былі разгледжаны накірункі сумеснай творчай дзейнасці пісьменніцкіх арганізацый Магілёўшчыны і Смаленшчыны, умацавання сяброўскіх адносінаў паміж імі.

Алег Дарагань паведаміў, што ў чарговым выпуску смаленскага літаратурнага альманаха «Пад гадзіннікам» надрукаваны рускамоўныя творы магілёўскіх паэтаў і пераклады іх вершаў з беларускай мовы, зробленыя смаленскімі перакладчыкамі. Госці з магілёўшчыны атрымалі ў падарунак выданні мясцовых аўтараў. У сваю чаргу, Мікола Яцкоў прэзентаваў смалянам літаратурны альманах «Брама».

Ул. інф. Магілёўскага аддзялення СБП

ВІЦЕБСК

Адбыўся сход Віцебскага абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Сябры арганізацыі сабраліся ў пашыраным складзе — пры ўдзеле старшыні Рады Барыса Пятровіча і першага намесніка старшыні Алеся Пашкевіча. Нагодай для такой сустрэчы стался важнае арганізацыйнае пытанне — пераабранне старшыні Віцебскага абласнога аддзялення.

Людміла Сіманёнак, якая ачольвала суполку апошнія гады, зрабіла выніковую справаздачу.


Фота У.С.

Пасля абмеркавання кандыдатураў адбылося галасаванне, у выніку якога новым старшынём арганізацыі пісьменнікаў Віцебшчыны была адзінагалосна абрана Анастасія Лазебная (Стася Наркевіч).

Віншуем і зычым ёй плёну і посьпехаў!

У.С.


Фота А. Казловай

МІНСК

Штогадовы шахматны мінітурнір прайшоў на офісе Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Гулялі сябры аб'яднання мінчане Андрэй Федарэнка, Васіль Жуковіч, Іван Клімянкоў, а таксама Вадзім Жылко (Лунінец) і Пятро Макарэвіч (Ліда).

Першае месца заняў Васіль Жуковіч, другое — Іван Клімянкоў, трэцяе — Пятро Макарэвіч.

ІМПРЭЗЫ

«МАМА МУ» Ў ГІМНАЗІІ

Спектакль паводле кнігі шведскай пісьменніцы Юі Вісландэр «Мама Му чытае і прыбірае» адбыўся ў Бараўлянскай гімназіі і сабраў аншлаг.


Фота З. Кандрацьевай

У пачатку сустрэчы бард Таццяна Беланогая ад імя кампаніі «Будзьма беларусамі!» зладзіла конкурс на веданне роднай мовы з прызамі – маляванкамі «Будзьма беларусікамі!».

Падчас спектакля дзеці вельмі ўважліва сачылі за жыццём Мамы Му і яе сябра Крумкача. Больш за тое, яны актыўна ўдзельнічалі ў пастаноўцы: лічылі разам з Крумкачом, адказвалі на пытанні актораў, суперажывалі і, безумоўна, апладзіравалі…

Спектакль «Мама Му» ўжо з поспехам прайшоў у многіх гарадах і рэгіёнах Беларусі (Мінск, Брэст, Дзяржынск, Слуцк, Заслаўе, Ждановічы, Мар'іна Горка).

budzma.org

ПОСТАЦЬ

ЯЎГЕНІЯ ЯНІШЧЫЦ: ЗАГАДКАВЫ ПАЛЁТ

Тамара АЎСЯННІКАВА

Жыццё маё, і там, на схіле,
Ты ўсё — загадкавы палёт.
Я. Янішчыц

У лістападзе спаўняецца 65 гадоў з дня нараджэння і 25 гадоў з дня трагічнай смерці знакамітай беларускай паэтэсы Яўгеніі Янішчыц, загадка якой і да нашых дзён цалкам не раскрыта.

Абранасць лёсу творцы пры яго жыцці мы не заўсёды заўважаем. Аднак пра Яўгенію Янішчыц гэтага сказаць нельга. Яна была і заўважанай і ацэненай. Але ж дачасна пакінуўшы жыццё, прыцягнула да сябе яшчэ больш пільную ўвагу. Паўстаюць пытанні: чаму? Што стала прычынай? Ёсць некалькі версій…

Я не згодна з тымі, хто лічыць прычынай самагубства нешчаслівае каханне. Не трэба глядзець так аднабока. Сама паэтка пісала:

Гатовая да ўсмешкі-запытання,
Да стоенай насмешкі з-за вугла,
Спазнала толькі я азы кахання?
Ды і ў такім — няшчаснай не была.

«Спроба сентыментальнага рамансa»


Каханне можа быць узаемным або не. Ды калі яно было, то гэта ўжо шчасце. І не цяжка здагадацца, якое каханне прыносіць мастаку больш плён. Да таго ж слова «каханне» ў паэзіі Я. Янішчыц сустракаецца не так і часта. Яна карыстаецца словам «люблю», якое мае больш шырокае значэнне, чым «кахаю»:

І тут, дзе радасць дыхае вясновa,
Дзе Млечны Шлях спадае
на зямлю,
Я светла прыпаду да дзеяслова
Твайго,
з маёй слязінаю «люблю».

Гэта радкі з верша «Паўночная зара». Майстэрства паэткі тут раскрываецца праз мнагазначнасць выказанай думкі. Слова «люблю» з верша можна аднесці і да кахання і да паэзіі. Любоў і паэзія для Янішчыц непадзельныя.

Першую кнігу яна хацела назваць «Непрыручаная птушка», але была напісана пародыя на аднайменны верш — і назву кнігі яна змяніла на «Снежныя грамніцы».

Я. Янішчыц хацела мець для першай кнігі чырвоную вокладку, але ў чырвонай выйшла першая кніга Ніны Мацяш. Жэня лічыла, што «чырвоны колер Ніначцы дасць сілу». Для сваёй кнігі яна выбрала колер неба — блакітны. На вокладцы — фотаздымак. Ён характарызуе яго аўтара як таленавітага майстра, які зазірнуў не толькі ў душу паэта, але і ў яго будучыню. Гэта мае асабістае бачанне. Я адчувала трагізм пры



Да слова трэба адносіцца з вялікай павагай і асцярожнасцю, каб нашыя думкі, выказаныя ўслых ці на паперы, не аказаліся намерам Бога. За прыкладамі хадзіць далёка не трэба

першым жа поглядзе на фотаздымак. Тады, у 1970 годзе, я адагнала ад сябе страшную думку. Але яна ўзнікала кожны раз, калі мне трапляўся на вочы той здымак. Маё ўспрыманне не змянілася і сёння. Мушу заўважыць, што менавіта тым фотаздымкам Я. Янішчыц закальцавала свой творчы шлях, змясціўшы яго ў апошняй кнізе выбранага — «У шуме жытняга свята». Ужо з самага пачатку ўсё складвалася не так, як планавала паэтка.

Верш «Непрыручаная птушка» заканчваецца радкамі:

Мяне ў палёце не скарылі.
А будзе што не так — малю:
Скруціце стомленае крылле
І кіньце ў родную раллю.

Што ж стала не так? Чаму Янішчыц пайшла з жыцця? Талент — гэта не толькі дар, але і крыж, які павінен несці абраны Богам. Палеская дзяўчынка, птушкай узляцеўшы на літаратурны Парнас, сама абарвала палёт. Мабыць, прыцягненне Зямлі аказалася настолькі моцным…

Не так даўно мне трапіў у рукі матэрыял ненадрукаванай кнігі Мікалая Еляневускага, вельмі цікавы і патрэбны для разумення асобы Я. Янішчыц. Еляневускі паспеў запісаць успаміны Марыі Андрэеўны, маці паэткі. Там я прачытала, як Жэня, яшчэ малой дзяўчынкай, ледзьве не ўтапілася ў Ясельдзе. Марыя Андрэеўна расказвала: «Ёсць там вір. Месца глыбокае. Вось хлопцы, хто старэйшы, у гэты вір нырца давалі, а потым выплывалі. Малых туды не пускалі. Магло закруціць. Што Жэню да гэтага віра штурханула, ніхто не ведае. Яна сказала хлопцам: «Думаеце, што толькі вы адны такія смелыя. Я тожа магу». Хлопцы пачалі смяяцца, а яна разагналася па беразе — і боўць у вір. Ну, і выплыць сама не змагла». Падлеткі яе выцягнулі, адкачалі. І калі Марыя Андрэеўна прыбегла, нехта з іх заўважыў: «Цётка Марыя, яна маўчыць, як на тым свеце пабывала». Хто ведае, можа, і пабывала. Містыкі сцвярджаюць, што тым, хто аказаўся перад тварам смерці ці перажыў клінічную смерць, часта адкрываецца нейкі дар. Яны паіншаму пачынаюць успрымаць свет. І мы не можам ігнараваць факт з біяграфіі Янішчыц, які мог паспрыяць раскрыццю паэтычнага таленту. Маці ўспаміналa, што Жэня часта сядзела каля таго віру, глядзела на ваду і аб нечым сваім думала. А на страхі маці гаварыла: «Ведаеш, матуля, так цягне, там такая бездань, аблокі ў ім (у віры — Т. А.) плывуць, як нідзе ў другім жыцці. Там, нават, і не вада зусім, а нешта такое, магнітнае». Я прапаную чытачу паглядзець на фотаздымак са зборніка «Снежныя грамніцы», аб якім вялася гаворка раней. У мяне такое ўражанне, што Жэня глядзіць у той ясяльдзянскі вір…

І колькі разоў Я. Янішчыц за свае 40 гадоў сутыкнулася са смерцю! Другі выпадак таксама быў звязаны з водою. У 1964-м Жэня стала пераможцай літаратурнага радыёконкурсу часопіса «Бярозка» і была ўзнагароджана пуцёўкаю на возера Нарач. У час купання ў возеры яна раптоўна пачала тануць. На дапамогу падаспеў Анатоль Грачанікаў. У Магілёве Жэня трапіла пад колы хуткай дапамогі. Так, нечая рука адводзіла смерць ад паэткі тройчы. Сакральнасць лічбы відавочная…

У аснове творчасці паэта ляжыць слова. І значэнне слова ў паэзіі не такое, як у зносінах. Яно мае магічную сілу ўздзеяння, можа матэрыялізавацца. Сапраўдны творца піша не як пісьменнік, а як маг. Таму да слова трэба адносіцца з вялікай павагай і асцярожнасцю, каб нашыя думкі, выказаныя ўслых ці на паперы, не аказаліся намерам Бога. За прыкладамі хадзіць далёка не трэба — гэта творчыя лёсы М. Рубцова, У. Маякоўскага, М. Цвятаевай, С. Ясеніна і іншых. У Я. Янішчыц таксама ёсць вершы, якія маглі паўплываць на яе лёс. Напрыклад: «Не дакарала, не журыла», «Вунь першая хмара павісла бянтэжна над краем» («Ясельда»); «Жывіце і любіце» («На беразе пляча»); «Яшчэ не збыты ўспамін», «На ўсякі выпадак…», «На голас ліры» («Каліна зімы») і іншыя. Тамара Каленікава, нашая сакурсніца, была сведкаю ў студэнцкія гады аднаго Жэнінага выказвання, якое ўспрыняла як браваду маладой паэткі: «Я пражыву 40 гадоў». Гэтыя словы Тамара ўспомніла, калі Жэні ўжо не стала. А Алег Лойка ў артыкуле «Кладачка тоненька» ўзгадваў, як на адным семінары па паэзіі Жэня Янішчыц сказала, што сорак гадоў жанчыне — гэта ўсё, гэта крэс.

Можна акрэсліць яшчэ адну версію: Яўгенія Янішчыц стамілася жыць, стамілася нечага баяцца. Прынамсі, на дачасную смерць паэткі, безумоўна, паўплывалі трагічныя жыццёвыя сітуацыі, абставіны адносінаў з творчымі асобамі, што прывяло да парушэння стану здароўя: да дэпрэсіі. І звычайны чалавек, перажыўшы трагічную смерць бацькі, развод з мужам, дарожную аварыю менш чым за год (канец мая 1975 — пачатак лютага 1976-га), можа аказацца ў складанай псіхічнай сітуацыі. Але быў і 1973 год, аб якім мы мала што ведаем. Толькі досведы і ўспаміны сведкаў. У інтэрв'ю, якое надрукавана ў газеце «Чырвоная змена» за 19 лістапада 1998 года, Сяргей Панізнік сказаў: «Недзе ў канцы 1973 года, у час Жэнінага лячэння ў Прыкарпацці, з ёю была ўчыненa правакацыя. Душэўны надлом не загоіш. А бязгрэшным можа быць хіба што арэшак: сам па сабе не трэскаецца». Вось з чым яшчэ прыходзілася спраўляцца Я. Янішчыц.

Падарвала яе здароўе і паездка ў Амерыку (1981). А паездка ў Фінляндыю ў 1983 годзе яе падкасіла канчаткова. Па дарозе назад паэтэса была шпіталізавана ў ленінградскую клініку. Па словах сына Андрэя, вярнуўшыся дадому, сказала: «Я ездзіла з мяснікамі». Барыс Сачанка пра Яўгенію Янішчыц пісаў: «Неяк яна паехала ў Фінляндыю. Вярнулася адтуль сумная. <…> — У Амерыцы мяне сёй-той выпрабоўваў… А цяпер у Фінляндыі… Няўжо мяне не ведаюць? — пытала яна».

У свае апошнія гады Я. Янішчыц двойчы лячылася ад дэпрэсіі ў Навінках. Каму з творчых людзей не знаёмы стан прыгнечанасці? Хто не сумняваўся ў неабходнасці сваіх высілкаў? Сёння звярнуцца да псіхатэрапеўта — звычайная справа. У савецкі ж час гэта было практычна прыгаворам. Я думаю, Жэню турбаваў не столькі сам факт лячэння, хаця і такую акалічнасць нельга ігнараваць, колькі тое, што будуць пра яе гаварыць у сувязі з лячэннем. У свядомасці Я. Янішчыц магла замацавацца думка аб змене свайго сацыяльнага статусу. У вершы «Дап'ём зялёнае віно» («Пара любові і жалю», 1983) яна пісала:

«Не дай мне бог сойти с ума», —
На Пушкіна малюся».

Творчасць Я. Янішчыц высока цанілася кіраўнікамі Саюза пісьменнікаў і Беларусі, і СССР, многімі мастакамі слова. Дарэчы, Максім Танк, сакратар Саюза пісьменнікаў СССР (1966–1986) і старшыня праўлення СП БССР (1967–1990) у дакладах часта называў імя Я. Янішчыц у пераліку з пісьменнікамі-мужчынамі, майстрамі слова. У сувязі з гэтым узнікала крыўда і зайздрасць з боку некаторых калег-жанчын, што азмрочвала жыццё і стан паэткі. З-за Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы, лаўрэатам якой Янішчыц стала ў 1986 годзе, разладзілася сяброўства з Таісай Бондар. «Жэня ўсё балюча перажывала», — сведчыла маці паэткі.

Знешне творчая кар'ера Я. Янішчыц складвалася сапраўды зайздросна. Але не ўсім вядома ўнутраная супярэчлівасць асобы паэткі. Так, пасля прапановы ўступіць у партыю яна доўга вагалася, раілася са школьнай сяброўкай Раісай Ганчарык: што рабіць?

Трагедыю Я. Янішчыц я бачу яшчэ і ў тым, што першай кнігай яна паставіла сабе вельмі высокую планку. І ёй больш не ўдалося ніводнай кнігай выклікаць такіх эмоцый у крытыкаў і пісьменнікаў, атрымаць столькі водгукаў, як пры выхадзе «Снежных грамніц». Рыхтуючы кожную новую кнігу, яна імкнулася зрабіць яе лепшай, чым папярэднія. Радасць ёй прынесла, бадай што, толькі «Каліна зімы».

Ці была магчымасць у родных і блізкіх прадухіліць трагічны палёт? Адназначна — не. Я. Янішчыц сама адлічыла сабе колькасць зямных гадоў — 40, якраз палову. «У боскай камедыі» Дантэ ў перакладзе М. Лазінскага ёсць радкі:

Земную жизнь пройдя до половины,
Я очутился в сумрачном лесу,
Утратив правый путь во тьме
долины.

«Утратив правый путь» — ёсць эмпірычная страта сэнсу жыцця. Хутчэй за ўсё Я. Янішчыц не бачыла ўжо сэнсу свайго жыцця: у яе не засталося ні фізічных, ні духоўных сіл, «клубочак ніткай суравой» падступаў да горла ўсё бліжэй, а сама яна паступова знікала «з люстэркаў усіх і з усіх фотаздымкаў».

Звернемся і да імя ды прозвішча паэткі, уникнем у яго сэнс: «Яўгенія Янішчыц — я геній, я нішчыць». Аб гэтым пісала Т. Шамякіна ў артыкуле «Мы былі аднакурсніцамі»: «Часам мне здаецца, што само яе прозвішча — праграма на самазнішчэнне: «Янішчыц — я нішчыць».

Я. Янішчыц свядома ішла «да палёту». У. Някляеў у сваіх «крынічанскіх» згадках засведчыў: «…яна знікла аднойчы з кампаніі ў нумары маскоўскага гатэля, дзе не стала некалі Купалы. Адзін з блізкіх ёй людзей занепакоіўся — і адшукаў яе на высозным балконе, амаль сілком пацягнуў назад, на што яна сказала: «Пакінь. Тут я гэтага не зраблю. Я зраблю гэта ў іншы час і ў іншым месцы». Іван Рыбіцкі, супрацоўнік радыё, распавёў аб апошняй сустрэчы з Жэняю Раісе Ганчарык, школьнай сяброўцы: яны сустрэліся на адной вечарыне, і Жэня запрасіла ўсіх да сябе на новую кватэру; на адгаворку прысутных: «Яшчэ паспеем», Жэня сказала: «Можа, і не паспеем»…

Перад сваім «апошнім палётам» Яўгенія Янішчыц наведала ўсе выдавецтвы, была ў добрым настрoі. Толькі ў роднай хаце яна дала волю сваім спрэсаваным эмоцыям і галасіла, як на пахаванні, — менавіта такой застала Жэню суседка Марыя Пятроўна. Ад'язджаючы з Велясніц, Яўгенія Янішчыц не запрасіла маці праязджаць да яе ў горад, як рабіла звычайна. Развіталася. І папярэдзіла: «У пятніцу чакай званка». Той пятніцай быў яе апошні дзень: 25 лістапада 1988 года…

ЭСЭ

ШТО ЗЖЫЛОСЯ З ЛІСТАПАДАМ

ДА ТВОРЧАГА ПАРТРЭТА МІКОЛЫ ПРАКАПОВІЧА

Алесь КАСКО

Наша сяброўства пачалося ў студэнцкія гады, а назаўсёды зніталася ў лістападзе 1974-га, на семінары маладых літаратараў у Каралішчавічах.


Яно мацавалася натхняльным подыхам коласаўскіх ялінаў з іскрынкамі першага снегу, зычлівымі, хоць не кожны раз ухвальнымі, словамі пра нашы вершапрактыкаванні такіх мэтраў, як А.Вярцінскі, Р.Барадулін, В.Вітка, Е.Лось, шматлікімі знаёмствамі з аднагодкамі, з якімі вялі спрэчкі не адно на паэтычных практыкумах. У кулуарах, вечарамі, распальваліся эмоцыі вакол яшчэ «падпольнага» тады «Сказа пра Лысую гару» і асабліва вакол «старой, якая не хоча паміраць», — роднай мовы. Даходзіла ледзь не да фізічных сутычак з тымі, хто ўжо меў партбілеты і адстойваў «мудрую» нацыянальную палітыку дзяржавы. Спадзяванні ж нашы былі іншыя — на народ ды найлепшых сыноў ягоных. Была вера і ў сябе, у сваю будучыню: «Абавязкова збудзецца ўсё, што сёння з лістападам не зжылося».

Ісці поплеч з такім аптымістам і жыццялюбам было лёгка і проста, хай ты і больш павольны за яго, і ўсумнёны. Разам дэбютавалі ў «ЛіМе» — адразу ж пасля творчага семінара, у калектыўным зборніку «Нашчадкі» — у 1979 годзе, асобнымі кніжкамі — у 1982-м… Мне, як і ягоным чытачам, ад самага пачатку ў вершах М.Пракаповіча імпанавала яшчэ адна, апрача патрыятычна-багдановічаўскай, пуцяводная зорка — мройная зорка свабоды чалавека ад гвалту, прыніжэння, неабходнасці быць «вінцікам» бяздушнага грамадскага механізму. Паэт нярэдка — у вершах «Кола», «Крылы», «Маналог прыпражнога каня», іншых — выходзіць на маштабныя філасофскія абагульненні, і ўсё ж агульналюдскія каштоўнасці і каштоўнасці нацыянальныя ў яго неад'емныя, дзве іпастасі свабоды злітныя, як святло падвойнай зоркі ў Сусвеце.

Невыпадкова ў канцы 80-х — пачатку 90-х гадоў ён бярэ самы чынны ўдзел у адраджэнскім руху, як вядома, не толькі культурніцкім: «Быць па-за палітыкай сёння — гэта таксама палітыка, выгодная тым, хто хацеў бы мець народ за маўклівы статак». Гэтак сказаў паэт Пракаповіч у тадышнім інтэрв'ю газеце «Вечерний Брест». І прызнаваўся, што невыносна цяжка пры гэтым адчуваць, калі «твая праца, твае намаганні разбіваюцца аб глухую сцяну людской абыякавасці, неразумення, прагматызму». Больш за тое, спробы «адушавіць» тую частку грамадства, што ўсмактала ў крoў дыктат важакоў мінулых дзесяцігоддзяў, небяспечныя, пагрозлівыя для цябе:

Спакушаная абяцаным раем,
раз'ятраная пахамі крыві,
нялася за сваёй здабычай зграя,
звужаліся, звужаліся кругі…

Запабягаючы, нагадаю, што апошняя ў пройдзеным часе кніжка М. Пракаповіча — «Трохперсце»; яна выйшла пяць гадоў назад да «круглага» юбілею паэта. Зборнік калектыўны, аднак перш за ўсё ягоны: менавіта яму належыць рыцарска-сяброўская ідэя паяднацца адной вокладкай з незабыўным рамантыкам Міхасём Рудкоўскім і сціплым аўтарам гэтага эсэ. У сваім паэтычным раздзеле «Літары на літоўцы» М.Пракаповіч па думцы, па нерву душы акумулюе і ўласцівае вершам «сааўтараў». Кранае гама пачуццяў, з якімі ён асэнсоўвае сённяшні ўласны маральна-псіхалагічны стан і стан краіны, народа. Пераважаюць характэрныя для цяперашняй беларускай паэзіі расчараванні, сумненні, трывогі. Паэтам-берасцейцам яны выказваюцца надзвычай абвострана, як, напрыклад, у радках пра адноўленую святыню Еўфрасінні Полацкай: «Крыж закляты — ён вяртаецца ў свой храм. Ці вернуцца душы, каб адрадзіць Радзіму?..» У іншых радках, аднак жа, скрозь боль і роспач прабіваюцца праблескі спадзеву і трывання: «Не зламацца… Хапіла б сілы дачакацца зоркі сваёй, — і з крыжа вырастаюць крылы, каб узняць цябе над зямлёй».



Фота з архіва аўтара

Самы пранізлівы, як на маё ўспрыманне, у Пракаповічавых «Літарах на літоўцы» верш пра радзінны кут, першакрыніцу жыцця. Такой шчымлівай танальнасці, здаецца, не сустракаў у сябра ніколі раней:

Знікае адзінае, што яшчэ маю, —
сядзіба радзінная над небакраем…
Куды я ступлю са світальнага
ганку,
калі ты забрала з сабой
калыханку,
дзяцінства грыбное, пякучыя росы,
слядок мой, безабаронны і босы?

Ды ўжо сам зварот да непазбыўнага, самага святога хіба не здольны мацаваць дух, асушваць чуллівую слязу? Яно ж было. Яно і ёсць — у сэрцы і памяці.

Міколаў бацька быў працаўніком завода, балазе вёска Пугачова лічылася прыгарадам Брэста, а неўзабаве ягонай «задымленай вуліцай з імем Суворава стала». Зацяты руплівец і маўчун, бацька мала ўмешваўся ў сынаву школьную вучобу ды ў ягоныя захапленні. «Папраўлялі» іншыя, не менш зычлівыя людзі. «Пішы пабеларуску», — параіў пачаткоўцу добры знаёмы, пасля і сябар, рускі паэт Дзмітрый Васільеў. Намацваў Мікола свае нацыянальныя карані і самастойна — праз «ліцвінства» (што азначала — непадобнасць, адметнасць) тутэйшых жыхароў, праз непаўторную прыроду, урокі, няхай і рэдкія, беларускасці ў школе, нарэшце праз сваю генетычную повязь. Ягоны дзед Ілья (Гальяш) са Слонімшчыны слыў майстрам не толькі пілы і сякеры, з якімі хадзіў у заробкі, але і скрыпкі. Не адзін верш прысвяціў яму ўнук-паэт. Менавіта такім вершам адкрываецца першы самастойны зборнік М. Пракаповіча «Неад'емнае» (1982):

Здаваўся бязважкім кляновы
смычок
Натруджаным пальцам ягоным,
А скрыпку лагодна прымала
плячо,
І хата сціхала ўтрапёна.

Рыхтык малюнак з майго маленства! Скрыпка была адна на ўсю маю вялікую вёску і рэдка з'яўлялася на вяселлях… Ці не перш за ўсё яна, скрыпка, увасабленне-сімвал і музыкі, і паэзіі, і мастацтва наогул?..

Гэтае, суб'ектыўнае, успрыманне пераношу на блізкую мне паэзію майго сябра. Так, у вершах М. Пракаповіча гучаць «эпічныя» дуда і ліра, зазыўная труба і вячысты звон, аднак яны чаргуюцца, а мінорны голас скрыпкі чуецца найчасцей, водгук яго ўлоўліваеш і ў інтымнай лірыцы, і ў творах грамадзянскіх, публіцыстычных. Яскравы кантрапункт, напрыклад, у такіх радках: «Ты апошні ў мяне — не знікай, астравок неспаганенай веры!» — і тут жа: «Быццам выйшаў адзін з цягніка часам золкім і шэрым».

Зрэшты, прыведзеныя радкі — з верша ўжо сталага паэта, аўтара зборніка з характэрнаю назваю «Мяжа надзеі» (1993), услед за якім паплылі матывы і зусім элегічныя, са скрыпкаю, што не спявае, а толькі «роспачная ўздыхае і слухае». У гады ж, калі ствараліся «Неад'емнае» і «На кругі свае» (1986), ні час, ні свет, ні будучыня не здаваліся шэрымі, святло пераважала над ценямі, смутак быў тым, што мы называем вядомым аксюмаранам «светлы сум» або, як М. Пракаповіч, «белай журбою». Гэта былі гады маладосці, кахання, рамантыкі, якая ў студэнцтве паклікала паэта на сопкі ў Сібір, а пасля філфака Брэсцкага педінстытута — углыб Палесся.

Настаўнічанне ў палескай глыбінцы, потым працяглая, аж дагэтуль, журналісцкая праца, пазнанне самабытнасці краю ў прыродзе, у людзях, у іх гісторыі і культуры моцна паўплывалі на творчасць паэта, узбуйнілі і паглыбілі яе. Найперш — духоўна ўзбагацілі самога аўтара. Таленавітасць народа не цуд, а неад'емная рыса, што складвалася і развівалася цягам многіх стагоддзяў, народнае мастацтва — яе праяўленне ў людзях найбольш здольных. Тое самае і з азначэннем паэзіі, калі без ідэалізацыі: гэта адна з формаў выказвання творчай асобы. Які ты ёсць у сваёй чалавечай сутнасці, такая твая паэзія. Ні больш, ні менш:

Язычнік я. Другой не маю веры.
І, заваражаны, гляджу,
Як тонкае лязо аеру
Блішчыць у кропельках дажджу…
…Тут шчырым быць я не баюся.
І як далёкі прашчур мой,
Я зноў надоўга застаюся
Сам-насам з небам і вадой.

Сёння язычніцтва, або паганства, з ягоным культам прыроды, роду і продкаў — не рэлігійная вера, не светапогляд, аднак жа вялізны культурны пласт мінуўшчыны, у якім нарадзілася столькі цудоўных вобразаў міфалогіі і фальклору, адкуль яны перайшлі ў прафесійную літаратуру і дасюль сілкуюць яе сюжэтамі, метафарамі і г.д. І калі сучасныя паэты, у тым ліку М. Пракаповіч, не цураюцца біблейскіх матываў, дык «індустрыяльнай» паэзіі ў нас так і няма, як бы ў нядаўнім мінулым ідэолагі ні заклікалі творцаў ісці ў нагу з «жалезным поступам сацыялізму». Куды прывёў гэты поступ, мы добра ведаем… На бяздумную ды бяздушную меліярацыю, як і на чарнобыльскую бяду, берасцейскі паэт адгукнуўся адным з першых, і адразу ж трывога за будучыню роднай, такой любай яму зямлі стала скразною ў ягоных вершах і паэмах. Яна яшчэ больш абвастрыла погляд паэта-патрыёта на гістарычны лёс народа, на незлічоныя і шматгранныя праблемы сучаснасці.

Добра, заўважу пры гэтым, што не ўмясцілася яна ў пракруставым горне публіцыстыкі, не шуганула толькі адкрытым, хай і палымяным, словам. Як лірык, М. Пракаповіч заўсёды дбаў пра глыбіню, вобразнасць і душэўнасць сваіх твораў, таму кранаюць сэрца чытача, напрыклад, паэма «Неад'емнае» са славутымі маналогамі, «Казкай пра чорта» ды іншымі раздзеламі, паэма «На кругі свае» з трапяткім вобразам белай птушкі — пракаветнага духу Айчыны, змястоўныя баладныя цыклы гістарычнай тэматыкі, многія самабытныя вершы пра мову, тую самую «старую, якая не хоча паміраць» (Н. Гілевіч).

Вельмі шкада, вядома, што апошнім, і немалым ужо, часам ліра (скрыпка) М. Пракаповіча маўчыць ці зрэдзь «правярае» струны. Скончылася «мяжа надзеі» на адраджэнне Айчыны і духу народа? Або на шчодрасць сваіх лістападаў? І ўсё ж гэта не азначае, што схаладнела душа. Яна, цёплая і жывая, шчымліва адзінотаю і, як раней, цягнецца да палескай прыроды, некранутыя астраўкі якой дзе-нідзе захаваліся, да мудрых і творчых людзей Палесся, хоць іх, на жаль, таксама ўсё менш, да нездрадлівых сяброў і сваіх вучняў-паслядоўнікаў, нарэшце да Слова — уласнага тэлеэфірнага і пісанага іншымі ў кніжках. Да кніжак многіх землякоў ён мае наўпроставае дачыненне, як да ўжо згаданага «Трохперсця», як да анталагічнага зборніка берасцейскай паэзіі «Дзядзінец» або калектыўных зборнікаў твораў пачаткоўцаў, укладзеных ім. З ліку літгуртkоўцаў, што займаліся пры абласным Доме моладзевай творчасці пад апекаю М.Пракаповіча, даўно сцвердзілі сябе яркімі паэтамі Максім Шчур, Ярына Дашына, Сяргей Прылуцкі. Літаральна ў мінулым годзе, дзякуючы яму, укладальніку і «прадзюсэру», пабачыў свет зборнік «…І нараджалася Слова» з твораў былых і цяперашніх супрацоўнікаў тэлерадыёкампаніі «Брэст». Сярод аўтараў — М.Рудкоўскі, В.Жуковіч, Н.Загорская, У.Ягоўдзік, Т.Сапач…

Ну, а ўнёсак у айчынную паэзію ўласнымі творамі — хіба ён малы? Ці не цягне на шматтомнік? І найперш — патрыятычнай лірыкай, а таксама лірыкай кахання; у датклівага чытача на слыху, думаю, шмат якія інтымна-спавядальныя радкі М. Пракаповіча — ад «я спяшаўся лугамі роснымі да дарасласці напрасткі» і да «з раніцы дворнікі спаляюць на лісці абцасікаў след».

Перабіраю адносна новыя паэтавы вершы і шукаю пільна патрэбны для канцоўкі майго эсэ. Вось ён, «Дыялектыка». Адценняў сумна-іранічных знарок не заўважаю — мяне радуе вось гэта:

…хапаю на поўныя грудзі
звонкі марозны ранак,
і як не было адчаю,
тупога падвальнага болю, —
я зноў залатога лісця,
пунсовых рабін абраннік!

Як мага часцей такіх настрояў, сябра, у 65-м тваім лістападзе і ва ўсіх пазнейшых: яшчэ ж многае, пэўна, збудзецца!

АБРАЗКІ

З цыкла «УЛАДЗЕВЫ ГІСТОРЫІ»

Уладзімір СІЎЧЫКАЎ

Зануда

Пасярод Балтыкі, на шведскай выспе Готланд, у горадзе Візбю, у міжнародным Балтыйскім цэнтры пісьменнікаў і перакладчыкаў спытаўся Уладзя ў дырэктаркі Лены Пастарнак, ці бывалі сярод гасцей незадаволеныя, бо ў Цэнтры проста ідэальныя, як на жыццё, так і на творчую працу, умовы. Па прыездзе кожны літаратар атрымлівае асобны пакой, можа гатаваць сабе што і калі захоча, вольны карыстацца бібліятэкай, відэазалаю, інтэрнэтам, саўнай, а таксама рознымі іншымі бытавымі выгодамі. Можна сумоўнічаць, таварышаваць з замежнымі калегамі альбо займацца сваім хобі. Аксана Спрынчан магла ў ахвоту фатаграфаваць, Валер Стралко — бегаць марафоны, Ірына Багдановіч — слухаць камерныя канцэрты ў храме, Валянціна Аксак — цешыцца кветкамі ў Батанічным садзе…

Лена, добрая і мудрая фея Балтыйскага цэнтра, на хвіліну задумалася і адказала:

— За дваццаць гадоў, а налета нам собіць адзначаць юбілей, быў, бадай што, адзін такі творца. Гэта Нікіфарас Александропулас, грэк з Крыта. Ён быў прафесійны тэатральны акцёр, але пісаў і п'есы, а да нас патрапіў па пратэкцыі ўплывовага і знакамітага суайчынніка-літаратара. Можаце, дарэчы, паглядзець ягоны аўтапартрэт і запіс у гасцявой кнізе.

— Цікава, зірну абавязкова.

— Пэўна, яму крыху не пашанцавала з надвор'ем, бо прыехаў сюды ўзімку, а таму хадзіў і ўвесь час скуголіў: «Зімна, сумна… Людзей на вуліцах, асабліва ў старым горадзе, амаль што не відно. А пісьменнікі ўсе сядзяць па сваіх келлях і ўсё пішуць, шрайбаюць, псуюць паперу або ляскацяць па клавіятурах!»

— Ну дык пісьменнікі на тое і прыязджаюць сюды, каб засяроджана працаваць! — Развёў рукамі Уладзя.

— І і ў Стакгольм выпраўляла яго на пароме, каб развеяўся, але і гэта не дало рады… Можа, проста не ставала эліну сонца і цяпла?

— Мабыць, ліцадзею найперш патрэбна была звыклая ўвага захопленай і ўдзячнай публікі, — з разуменнем і спачуваннем пасміхнуўся Уладзя. — Хай бы на скрайні выпадак ішоў на бераг мора, набіраў у рот каменьчыкаў і як той Дэмасфен шліфаваў сваё акцёрскае дый аратарскае майстэрства! Відавочна, што крыцянін той патрапіў не ў тое месца і ў неспрыяльны час.

13 верасня 2012 года

«Куды ні трапяць беларусы!»

Прынёс Уладзя ў штотыднёвік творчай інтэлігенцыі дзённікавыя запісы пра пачатак грузінска-абхазскага канфлікту, сведкам якога стаўся падчас адпачынку ў Доме творчасці «Піцунда», на беразе ўнікальнай субтрапічнай бухты. Рэдактар Мікола Г. прагледзеў іх, паабяцаў неадменна паставіць у бліжэйшы нумар і нечакана заявіў:

— А я вось аніколі на аніякім моры не быў і не хачу!

Зніякавеў Уладзя і нават не ведаў, як на тое рэагаваць, бо падобныя рэчы звычайна не афішуюць.

Паэтка Раіса Б. на літаратурнай вечарыне ў літоўскай амбасадзе, дзе прэзентаваліся некалькі перакладных выданняў, абвясціла, што напісала драматычную паэму пра Барбару Радзівіл, але аніразу не была ў Вільні.

«Беларускі літаратар, які не наведваў віленскія музеі і архівы, не блукаў па віленскіх вулках і могілках, не цешыўся з сабора Святой Ганны і з касцёла Святой Тэрэзы з Вострай Брамаю, — гэта поўны нонсэнс!»

Мабыць, так падумаў амбасадар Эдмінас Багдонас, а ўслых абвясціў:

— Я заўтра ж распараджуся ў консульскім аддзеле, каб спадарыні па-за чаргою выдалі аднаразовую бясплатную візу!

Масцітыя празаікі ў парадку добразычлівай крытыкі асцярожна закідалі аўтару трылогіі пра заходнебеларускую вёску Вячаславу А., што ён так і не вывез аднаго са сваіх галоўных герояў у тую самую Вільню, дзе паэт-патрыёт мог бы перастрэцца з «нашаніўцамі» і з іншымі дзеячамі культуры.

Што гэта ўсё — праявы душэўнай ляноты, шарачковага правінцыялізму ці неразумнай бравады?!

Часы імкліва мяняюцца.

Сёння па свеце можна падарожнічаць з дапамогаю сатэлітавага тэлебачання дый інтэрнэту, досыць нескладана выправіцца ў аўтобусны тур па ўсёй Еўропе ці нават у акіянскі круіз.

Рэдактары з задавальненнем возьмуць у свае партфелі і апублікуюць эсэ або падарожныя нататкі, у якіх расказваецца пра свет вачыма беларуса ці як жывуць і пачуваюцца суайчыннікі па-за межамі метраполіі.

Дый калі праглядаць біяграфічныя звесткі літаратараў, дык ужо стала звыклым бачыць гарады і мястэчкі не толькі суседніх, але і дальніх, і нават экзатычных краін. Ужо не дзівяць ні чэская Прага, ні нямецкі Гамбург, ні фінскі Хельсінкі, ні нарвежскі Буда, ні шведскі Гётэборг, ні амерыканскі Чыкага, ні канадская Атава, ні ізраільскі Эйлат, ні двойчы немілагучна на беларускае вуха мексіканскі Гуана Хуата, ні нават невялічкае паселішча ў эквадорскай сэльве…

На дзень пісьменніка, 3 сакавіка. 2013 год

Хітраван


У Доме друку журналіст-газетчык Міхась Т. меў за звычку ў працоўны час надоўга сыходзіць нібыта ў курылку папрацаваць з аўтарам або паабедаць у кавярню «Чорны бусел», а то і ў «Батлейку», званую ў народзе «Тэлевізарам» з-за сцен-вокнаў, праз якія заўсёднікаў было відно як на тэлеэкране.

Але быў Міхась вельмі абачлівы — заўсёды пакідаў на працоўным стале напаўспісаны аркуш, ручку-самапіску і «дзяжурныя» акуляры, каб калега і сусед па пакоі пры патрэбе мог прыкрыць ад рэдактара ці наведнікаў:

— Ды недзе тут ён, толькі што выйшаў! Вось бачыце, акуляры ляжаць, а без іх ён анікуды!

Ішоў Міхась у нагу з прагрэсам — з цягам часу дадаў да свайго рэквізіту і састарэлы мабільны тэлефон, а фактычна муляж — без SIM-карты і без акумулятарнай батарэі…

3 траўня 2013 года



Фота Р. Шастак

Класікаў жарт

Ва Уладзевай калекцыі ледзь не тры дзясяткі варыянтаў ягонага імя, занатаваных з літаратурных твораў, з лексікаграфічных крыніц — з «Падручнага расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка» Вацлава Ластоўскага і іншых, з гутарковай мовы: Уладзімір, Уладзімер, Валодзя, Валодзік, Валодзька, Валодусь, Валадар, Валадамір, Вальдэмар, Ладзік, Ладук, Ладак, Уладук, Ладысь, Уладысь, Уладзя, Уладар, Уладамір, Вова, Вавусь, Ваван, Вавіла, Вавуля, Воўка, Воўчык, Валадзімер, Ладзімер, Ладша, Валодша…

Ягоны добры суразмоўца Генрых Д. гукае Уладзю, калі яны вечаруюць на лысагорскіх сотках на сваёй вуліцы сам-насам, без жанок і без суседзяў, не іначай як «Вальдэмаро!» — чуецца яму ў гэтым варыянце імені штосьці заходняе і рамантычнае.

Уладзя тады зазвычай згадвае, але кожнага разу стрымліваецца, не паддаецца спакусе паўтарыць знаны жарт на адрас старэйшага таварыша, без пяці мінут класіка.

— Генрых! — На ўсю моц гукаў колісь спаўбрата па пісьменніцкім цэху Уладзімір Караткевіч, а калі Генрых Д. адзываўся і падыходзіў, дык махаў рукою: — Ды гэта я не цябе! Гэта я Гётэ, заканчэнне першай часткі «Фаўста» цытую!

1 чэрвеня 2013 года

Погляд збоку

Паводле дамовы пра супрацоўніцтва Беларускі і Тбіліскі універсітэты яшчэ ў васьмідзясятыя гады пачалі абменьвацца студэнтамі і аспірантамі, праводзіць сумесныя навуковыя канферэнцыі, спрыяць адно аднаму рыхтаваць выкладчыцкія і навуковыя кадры.

Філолаг, цёзка па прозвішчы знакамітай спартсменкі, чэмпіёнкі свету па шахматах Нана Гапрындашвілі напачатку сваёй стажыроўкі ў Менску дужа дзівілася бесцырымоннасці і нахабству, як ёй здавалася, беларускіх студэнтаў.

— Ну як гэта можна, — абуралася яна, — пры сведках ці нават проста ў вочы зваць велешаноўных прафесараў, дацэнтаў і выкладчыкаў alma mater па мянушках: Воўк, Бурак, Шуба, Самец, Сыракваша?! А дзе іхняя студэнцкая салідарнасць?! Хіба можна іменаваць суседа па ўніверсітэцкай лаве Гусак, Верабей ці Дворнік?!

З цягам часу дазналася Нана, што ненадзейнымі з ідэалагічнага пункту погляду філолагамі пастаўлены кіраваць няпрофільны выкладчык гісторыі Камуністычнай партыі Савецкага Саюза дацэнт Аляксей Арсеньевіч Волк, які прабыў на пасадзе дэкана факультэта дваццаць тры гады! Уведала яна, што загадчыка кафедры рускай мовы прафесара Паўла Паўлавіча Шубу некаторыя акадэмічныя калегі з мяккай іроніяй звалі ППШ, бо абрэвіятура тая супадала з найменнем савецкай стралковай зброі — пісталета-кулямёта Шпагіна. Адкрыццём грузінцы сталася, што такія прозвішчы, як у загадчыка кафедры сучаснай беларускай мовы прафесара Леаніда Іванавіча Бурака, у беларусаў зусім не рэдкасць.

Але ніяк не магла яна ўцяміць, як выкладчык з адметным прозвішчам Самец, якім мужчына мусіў бы ганарыцца, ажаніўшыся, узяў жончына прозвішча, што амаль немагчыма ўявіць у Закаўказзі, і стаўся амаль безаблічным Уладзімірам Н…ам.

Ды чамусьці зусім не бянтэжыла яе прозвішча каляжанкі Ніны Сурамелашвілі, з якой пазней працавала яна ў Тбілісі ў Доме дружбы народаў пры Акадэміі навук Грузіі. Літаральна яно перакладалася з грузінскай як «дзіця гладышa і лісіцы». Але пытаннем, як той дзіўны саюз змог стацца плённым, Нана чамусьці не задавалася…

На Купалле, 6 ліпеня. 2013 год

Дарчыя подпісы

Прынёс Уладзя сваю чарговую кніжку Паўлу К., які быў у штотыднёвіку і за літаглядальніка, а той разгарнуў яе і здзіўлена ўскінуў бровы.

— А чаму не падпісаная?

— З задавальненнем пакіну на форзацы свой аўтограф, бо вы пра гэта просіце. Але з пэўнага часу не вельмі спяшаюся з подпісамі…

— Патлумачце, з якой прычыны.

— Ды вось бачыў аднойчы, як у рэдакцыю часопіса ў паўпадвале на вуліцы Кісялёва паэт Алесь Р. прынёс важкі стос кніжак. Зваліў іх проста ў кут у калідоры і прапанаваў калегам: «Бярыце, каму трэба». Знайшліся сярод тых тамоў з хатняе бібліятэкі і некалькі з дарчымі подпісамі паэту ад спаўбратоў па пісьменніцкім цэху!

— Згодны, адно, калі знаходзіш кніжку з аўтографам у «Букіністе», куды прыбарабаніл ie нашчадкі пісьменніка, каб крыху падзарабіць. Але гэта зусім іншы, прыкры варыянт.

— З таго дня падпісваю свае кнігі толькі калі ўпэўнены, што іх ацэняць і запатрабуюць адрасаты.

— А калі такой пэўнасці няма?

— Тады, лічу, лепей перадаць кніжку «цнатлівай»: «атрымант» зможа прагледзець ці нават прачытаць яе, а потым абмяняць ці перадаць у рэдакцыйны збор…

— Або ў публічную бібліятэку.

— Так. Але былі і выпадкі, калі шкадаваў, што том не падпісаў.

— Гэта як жа? Чаму? — Спытаўся Павал.

— Спрэзентаваў неяк чытанку дзецям малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту «Крынічка» шаноўнай Святлане К. Яна падахвоцілася і напісала ў газету вельмі сімпатычны водгук. Панесла да галоўнага рэдактара, каб паставіў у бліжэйшы нумар і прыхапіла ў кабінет «сыходны матэрыял». Шэф рэцэнзію ўхваліў, а потым пагартаў хрэстаматыю і… скарыстаў службовае становішча — прысабечыў кніжку са словамі: «Якраз такая патрэбная цяпер маёй унучцы-пяцікласніцы!»

— І праўда, каб стаяла на кніжцы ваша дэдыкацыя, дык не забраў бы!

— А каб закрыць на сёння тэму дарчых подпісаў, раскажу пра яшчэ адзін, «дэманстратыўны» выпадак. Малады мастак Рыгор С. атрымаў ад Таісы Б. зборнік вершаў з подпісам-пажаданнем, каб заўсёды заставаўся такім, якім ён ёсць. Праз некалькі гадоў, калі Таісія Мікалаеўна кінулася апантана служыць новай уладзе, пасталелы мастак прыйшоў у рэдакцыю «Літаратуры і Мастацтва», якую яна тым часам ачольвала, і прылюдна аддаў ёй той зборнік: «Я застаўся, як вы мне зычылі, — такім, які і быў. А вось вы моцна змяніліся, выракліся ідэалаў, якія абвяшчалі рыфмаванымі радкамі. Таму сёння кніжку вашу вяртаю пры сведках!»

На Дзень беларускага пісьменства. 2013 год

НАЧЫРКІ

АДЗНАКА

Алесь МАСАРЭНКА

Дзеці

Дзіўна, Антон Чэхаў сказаў, што шлюб не збаўляе ад адзіноты. Ці не занадта?!. Ён гэтак выказаўся, мусіць, што не зведаў бацькоўства, у аснове якога важкім пастулатам выступае духоўнасць.

Жыццё сямейнае — гэта перш за ўсё — так! — дзеці. Яны — і тваё сёння, і тваё заўтра у будучым. Менавіта дзеці й ёсць тыя самыя ластаўкі, якія прыносяць вестку, што адзінота прайшла і больш ужо ніколі не вернецца, бо ў душы, з табой — заўсёды яны, твае пестуны-жэўжыкі.

Для пісьменніка сям'я — гэта сапраўды яшчэ і ты Сам. А Сам ты часам бываеш усякі: і страхотна занудлівы, прымітыўны, і нярэдка глухі да блізкай табе палавіны. Табе і таго не стае з яе боку, і гэтага, яна і замінае, і безуважна ставіцца да цябе. Здаецца, што і разумення бракуе абодвум, і цярплівасці таксама. А з дзецьмі якая можа быць адзінота?!. Тут сямейны звяз духоўна счэплены, на геннай аснове.

Жыццё — не цікаплынь: похапкам, уподбежкі скача, несупынна і апантана, і дзе ўжо, здавалася б, той самай духоўнасці брацца?.. І тым не менш — яна мусіць быць, духоўнасць. Без яе нельга чалавеку. Непаразуменні й разводы — ад бездухоўнасці, так.

Хухуля

— Іншы раз сварка — папраўка. А сённяшняя, з Хухуляй, не проста сварка — вайна. І з чаго ўсё пачалося? Выгнала я карову на ранкі. Прайшлі каровы. Стаю ля весніц. Бачу, ідзе суседка, ваду нясе: цёх-цёх... Цяжка сунецца, сагнулася ў крук. Недзе за семдзесят ёй, стапталася баба. Гляджу — не адварочвацца ж, чакаю, пакуль пройдзе, каб пасля і самой па ваду ісці. Усякія прыкметы ёсць. Яна з поўнымі вёдрамі, то і добра. А я пакажыся з пустымі — падумае, што выйшла, каб сурочыць.

— І што ж — прайшла-такі міма?

— Во-во пройдзе, сігнёў колькі засталося — і міне мяне... Аж тут дужка ў вядры — хроп! Вядро стойма ўпала, троху вады пралілося. А другое так кавырнула каромысел, што ён крутма адляцеў убок, заадно хвоснуўшы Хухулю па плячы. Зноў жа, і гэтае вядро, другое, не абярнулася, але вады ў ім засталося не больш як напалову. І пачалося... Як жа яна ўсхапілася — крычма-крычала: я і такая-сякая, і ведзьма, і змяя-падкалодніца. Ухапіла каромысел і грозіцца. А тут якраз Анюта, насупроць жыве, выйшла на крык і кажа: «Сціхні ты, пудзіла, не палохай вуліцу!..». Эх, яна ўсё тое ж самае і ў яе адрас паўтарыла. Ды яшчэ пахватней, з прытупамі. На лямант і бацька твой вытыркнуўся. Ён жа такі — без спагады не абыдзецца. Узяў вядро з абарваным вушкам і панёс у двор. Хоць і аднарукі, а доўга не затрымаўся. Выбіў заклёпку, на якой вушка трымалася, і ў гэту дзірку ўтыркнуў загагулю вочапа.

— Ён правільна зрабіў — добрай справай намоўленыя праклёны скіраваў на сухі лес.

Шрам

— І гэта дзе ж цябе, суседзе, калі не сакрэт, параніла: няўжо, калі служыў у спецвойску, спрычыніліся тыя гулагаўскія зэкі, што ўцяклі ў тайгу, а вы іх вылоўлівалі?.. Помню, ты гэта мне расказваў.

— Зеков живьём не брали — всех, кто имел хотя бы какое оружие, пускали в расход... Такой приказ был. Где-то их человек тридцать погибло. Все они были — так называемые, враги народа, политические.

— І колькі ж «ворагаў» ты асабіста ўхайдокаў?

— Я там около года служил водилой до перевода в Ленинград. Помню, нас, роту охраны, подняли по тревоге, и мы выехали в тайгу. Лично я тем и был занят, что свой студэбеккер охранял. И только. Слышал выстрелы. Поскольку ни один зек не выбежал в сектор моего наблюдения, стрелять мне не пришлось. Душа моя чиста. А ранен был ещё в пятилетнем возрасте. Хорошо помню тот день... Немцы отступали. Наши танки гнались следом и лупили из пушек беспрестанно. Один снаряд и вспорол землянку: трое человек убило, меня ранило — осколок впился в ногу чуть выше колена. Я с испугу хватился за него — так он был сильно горячий... Потерял сознание. Очнулся, когда немецкий врач зашивал рану. Он посмотрел мне в глаза и сказал: «Гут, киндер... Молойдец!..». Снаряды рвались вдоль по дороге. Медсестра, стоявшая рядом, похоже, ругала коллегу, на чём свет стоит, но всё же помогала ему. Шофёр санитарного фургона (красные кресты по бортам) мотора не глушил. И ещё помню — мама отдала врачу узелок с вареными яйцами (приготовила, пока тот колдовал над моей раной).

— Нямецкі доктар выдаліў асколак з тваёй нагі?.. Бач, не збаяўся, дапамог.

— Мама кинулась к санитарному фургону, держа меня на руках. Я истекал кровью, уже не плакал... Да, то был настоящий врач — не изменил клятве Гиппократа.

— І што ж — нашыя танкі, канешне, накрылі той фургон?

— Ещё чего — фургон укатил как раз вовремя... Хаты все сожжены, лишь только уцелевшие печи стоят. Танки наши ворвались в деревню, люди выбежали на улицу, плачут от радости... А где-то часа через два заходят к нам в землянку двое военных, офицеры, и — прямичком ко мне. Я лежу на полатях. Один из них подошёл и с ходу взялся разбинтовывать рану, мама кинулась к нему — отпихнула, что-то такое сказав, на что он даже выругался. Потом эти двое произвели обыск и, ничего не найдя, удалились.

— Дык чаго яны прыходзілі?

— Им кто-то из сельчан сказал, что немцы будто бы оставили у нас какую-то ценную вещь.

— А яны такі нешта ж пакінулі?



Шмат каму з нацадшчапенцаў прыходзіцца нагадваць, што яны, збаёднікі-недавучкі, сякуць той самы сук, на якім утульна сядзяць і, замашна бэрсаючы нагамі, разам з урадоўцамі галёкаюць на нікчэмнай «трасянцы»

— Порошок... Присыпать рану. В баночке. Мама потом иголки там прятала и две катушки ниток: на одной — черные, на другой — белые.

— Суседзе, вось мы, беларусы, ужо ці не дваццаць гадоў на адной лесвічнай пляцоўцы сустракаемся, стаім, размаўляем... У цябе вышэйшая адукацыя, ды нешта ж увесь час грэбуеш родным словам. Як гэта разумець?

— А так и понимай — технократ я, не филолог. Мне, признаться, английский язык больше нравится, чем русский, но у нас он не особо культивируется.

— Ты маеш рацыю: тэхнакрат — асоба чужыя гаршкі лізаць... Даруй, але гэты народны жарт — якраз у твой агарод.

Адзнака

Так сталася, што яшчэ ў школе я стаў рупіцца над словам, і — вось жа! — пакуль не адклаў асадку ўбок, не сахвоціўся. Больш таго, замест пішучай машынкі ўзграмосціў на свой пісьмовы стол камп'ютар. А які ж гэта цудоўны памагаты! І так ён дарэчы, так захапляе і ўцягвае ў працу, што з яго дапамогай сёння проста грэх не выбіцца ў парнасца. Кажу гэта, вядома, жартам, а калі шчыра, дык я, здаецца, усё аддаў бы дзеля таго, каб адно пісаць не горш за Максіма Гарэцкага, якога лічу класікам, і прозу якога чытаю з захапленнем.

Пісьменнік — няпросты чытач, бо выбірае пераважна кнігі адметных аўтараў. Хто яму па душы. Стаць адметным нялёгка, але ж, каб такім стаць, трэба навучыцца пісаць адметна.

Каго браць у настаўнікі? А хоць бы й свайго земляка, мсціслаўца. Ён у нас бадай адзіны такі на Магілёўшчыне. І не памешчык, і не граф. Як і Максім Горкі, дамогся ўсяго самаадукацыяй.

Максім Іванавіч Гарэцкі — глыба моцная, духоўна-касмічная. І гэта сапраўды так: яго нарадзіла эпоха — як неабходнасць, як патрэбу. Пальмяны сын нацыі быў расстраляны нкусаўцамі адразу, як толькі выйшаў з-за кратаў. Не далі й аддыхацца чалавеку, нагаварыцца з сябрамі ды роднымі...

У сваім дзённіку Усевалад Іваноў, калі быў у Ташкенце падчас эвакуацыі, абураўся, што цяжка, маўляў, хадзіць па горадзе, не чуючы жывой рускай мовы... Бач, яму цяжка было, дарма што бадай уся Краіна Саветаў адно і гаварыла на гэтай мове. А што ж казаць мне, беларускаму пісьменніку, калі й сёння, ідучы праспектам, — хоць ты яго ўвесь прашпацыруй! — нідзе не пачуеш, каб хто размаўляў па-беларуску. А калі й пачуеш, то адразу ж і пазнаеш таго чалавека: пісьменнік альбо журналіст. Дый не ўсе журналісты карыстаюцца роднай мовай — большасць «русяць», не хочуць быць «казламі адпушчэння», як кажуць некаторыя з іх , асабліва тэлевізійшчыкі.

Вядома ж, некалі й мне як творцу час выставіць сваю адзнаку. А пакуль — шмат каму з нацадшчапенцаў прыходзіцца нагадваць, што яны, збаёднікі-недавучкі, сякуць той самы сук, на якім утульна сядзяць і, замашна бэрсаючы нагамі, разам з урадоўцамі галёкаюць на нікчэмнай «трасянцы».

Шляхетная вёска

Алесю Пашкевічу, ураджэнцу вёскі Набушава

Кажуць, продак былых прэзідэнтаў ЗША, Буш, нарадзіўся на Случчыне. І быў нябога бязбацькавічам, падлеткам збіраў кускі, ходзячы ад хаты да хаты. Хутаранцы падкармлівалі паправашайку — давалі, хто што мог, і прыгаворвалі: «На, Буш, на...»

Вырас хлапчына і з'ехаў у свет сваё шчасце шукаць. А словы спагады да яго — няўзнак, самі па сабе ўцеміліся землякам у памяць, леглі на слых, і неўзабаве практычна-кемныя хутаранцы назвалі свае адасобленыя падворкі-засценкі вёскай Набушава. А што — каларытны назоў, з гумарынкай!

У такім населеным пункце нарадзіцца і не стаць вялікім — проста немагчыма. Вось, раблю адкрыццё: менавіта гумар і ёсць каталізатар паскоранага росту творчай асобы. Слуцакі — о, гэта здаўна вядома! — не прастакі, людзі выбітныя, з досціпам: смех — у мех і патахонілі на базар. А набушаўцы, чуў, нават самагонку з жартаў гоняць: весялуха — не ўпіцца!

І я, папраўдзе, намерыўся быў нешта адметнае згумарыць у адрас Алеся Пашкевіча, свайго маладшага калегі па пяру — згадаць хоць бы й тое, што, як мне, так і яму было нялёгка прабівацца ў горадчукі, ды яго зямеля Буш, бачыце, зблытаў карты — перацягнуў коўдру на сябе...

Буш аб'еўся слуцкіх груш
і выцудліў гарэлкі кварту —
інакш скасіў бы паляруш
ці акалеў дзе ад інфаркту.

Слуцак Амерыкі дасяг
і на даляры расстараўся...
Былы знядолены басяк
крутым капіталістам стаўся.

Як відаць, і сёння стае беларусаў, якія едуць у свет як у капейку — не па капейку, вядома, а па доўгі рубель. Роўна, як і той жа Буш, аматар груш.

А ёсць беларусы, каторых у замежжа не цягне, бо прыкіпелі душой да сваёй зямлі, роднай мовы й культуры. І ня бі білі ў дугу запанела-зрусіфікаваныя гарадчукі, нацадшчапенцы, якімі б мондрымі ўказамі ні адмахваліся ад «бульбашей-колхозников», аднак беларускамоўныя прадстаўнікі вёсак і райцэнтраў, энергічныя хлопцы й дзяўчаты — будуць і надалей, нават больш напльюўна насычаць не толькі сталіцу, але і абласныя цэнтры жывільнай сілай нацыі. Закон самазахавання дзейнічае, і скасаваць яго ніхто не зможа.

Упэўнены, Беларусь дачакаецца свайго яснага дня, калі нехта такі вось, як і я, пісьменнік, выйдзе аднойчы на праспект і скрозь, паўсюль будзе чуць сваю родную мову і радавацца...

Такое абавязкова прыйдзе — я ніколькі ў гэтым не сумняваюся. Адно каб вёску нашу не заглушылі зрусіфікаваныя ўшчэнт гарады з іх урбанізавана-нявызначанымі, далёка непразрыстымі, як сёння, сацыяльным ладам і нацыянальнай ідэяй.

Час

Беларусы — людзі балотныя, лесавікі. Таму і ацалелі, бо хавацца ад татарвы й маскавітаў, ад шведаў ды французаў, палякаў ды немцаў было дзе — на патайных балотных выспах ды сярод непраходнай лясной глушэчы.

Беларуса часам і сапраўды даволі цяжка разварушыць, выбіць з наезджанай каляіны. Яго на жарсціну стаў голымі пяткамі — і ён будзе зацята трымацца ў межах звыклай талерантнасці, без крыку і выку. Яму баліць, але не плача, бо слёзы свае даўно выплакаў...

Беларус здавён аднолькава ненавісна глядзеў у вочы як русіфікатарам з усходу, так і паланізатарам з захаду. І ўсё дзеля таго, каб адно выжыць, дачакацца больш спрыяльнага часу, сваіх лепшых дзён.

І такі час настаў. Стваральны й вольны. Я пэўны ў тым, што праз адно-два пакаленні нашыя суседзі, у нядаўнім былым — сквалыгі й зайздроснікі, стануць надзейнымі — не разліць вадой! — сябрамі. Гэта адзінае, што яны мусяць зрабіць, бо ўвогуле ні другога, ні трэцяга — ім не дадзена...

ВЕРШЫ

SEX-ЦЫКЛ

Рыгор БАРАДУЛІН



Фота Г. Чаркаэзна

SOS

Рассыхаецца ралля —
Просіць лівень ліцца.
Я трымаю жураўля,
У цябе сініца.

Нецуглянак я люблю
Нечаканай масці.
Дай напіцца жураўлю,
Дай да дна прыпасці.

Я адзін, і ты адна,
Дай спатолім смагу,
Дай да дна, да дна, да дна —
Разбушуем брагу.

Мель астудзіць пыл і хмель,
Ацвярэзіць згубай.
Абап'ецца журавель
І абвяне дзюбай.

SOS, SOS — дай жураўлю напіцца,
SOS, SOS — гарачая крыніца.
SOS, SOS — куніца загарыцца,
Журавель упёрся ў мель.

Сінеюць цені…

У гарачага кахання
Мітуслівае насенне.
Дзе спаткацца з Вамі, пані,
На канапе ці на сене?

На канапе мне скрыпуча,
А на сене Вам калюча.
Гулка гоцкацца на даху,
А на вуліцы хопіць страху.

У шалёнага кахання
Пазбіваныя калені.
Ад зялёнага ўздыхання
Пад вачмі сінеюць цені.

Свой ніколі шал не ўцэнім,
Аддамо ўсе сілы справам.
Дзе, скажыце, нашым ценям
Стаць адным, але рухавым?

Маладое нецярпенне
Рассакрэчвае сакрэт.
Шчыльна два знікаюць цені,
Трэці цень зірне на свет.

Пытанне

Моцнае, як смерць, каханне,
Не слабейшае віно.
І калі пытанне ўстане,
Мусіць мець адказ яно.

У мяне пытанне ўстала,
Памажы ўлажыць яго,
Як назваць яго прыстала:
І-га-га ці о-го-го?

У віна дзе трэба вочы
І салодкая віна.
Здай дзявочы сорам ночы,
Хай схавае давідна.

Легчы ўдвух якраз дарэчы,
Каб спачыла галава.
Як знайсці ў такой цямрэчы,
Дзе мякчэйшая трава?

Ветах небам ходзіць пешшу,
Хоць яго ніжэй прыклей.
Я табе ліхтар падвешу,
Каб ісці было святлей!

Будзе…

У мяне шаршатка маладая,
У цябе сукрыстая аўчынка.
Хутка ўжо зіма захаладае,
Дык пашыем кажушок, дзяўчынка!

Дай, як хмарку, вымякшыць аўчынку,
Як маланку, вызіхціць шаршатку.
Каб нікому не было спачынку,
Будзем пачынаць усё спачатку.

Завіткі ў аўчынкі, як дукаты.
Шчасце мае той,
Хто мае снасці.
У шаршаткі кончык тупаваты,
Каб шчыльней да сутнасці прыпасці.

Не ад страху задрыжаць каленькі.
Памаўчаць захочуць нашы плечы.
Хоць пашыем кажушок маленькі,
Горача ў ім будзе, як у печы!

Варта!

Вабную і трапяткую
Вас шапчу,
Па Вас шалею.
Вы — лампада,
У якую
Мне карціць падліць алею.

Як туман той над ракою,
Сум гусцее з непрыкмету.
Вы — лампада,
За якою
Я пайду на край Сусвету.

Мне нідзе няма спакою.
Крык мне толькі імпануе.
Вы — лампада,
Без якое
Змрок у сэрцы запануе.

З Вамі небасхіл шыкуе
І бляднее зорак варта.
Вы — лампада,
У якую
Добры кнот уставіць варта!

Пералётныя рукі

З Рубока Шо

* * *

Цябе сярод акацый чакаў.
Уздрыгваў, шчодры на лёсткі,
Пры кожным шоргаце, як падлетак.
Падаюць зноўку пялёсткі
Бялюткіх кветак.

* * *

У тэпціках лёгкіх
Да мяне ты прыбегла.
Дождж з начы яшчэ спіць.
Брамка з галінак нягегла
Рыпіць і рыпіць…

* * *

Ты сябе аддаеш,
Не вагаючыся ні хвіліны,
Кладзешся смела,
Як птушка з галіны —
Сукенка зляцела.

* * *

Ты крыкнула,
Не ўпершыню
Знайшоўшы рукой жазло.
І зноў цішыню
Убакі павяло.

* * *

Ты п'яная на ўзложжы
Пазняволілася ад лагоды.
Жомчуг на грудзёх перабіраеш
дрыготка.
І дня не ўяўляеш без насалоды.
Цела тваё — быццам котка.

* * *

Малютка з квартала Сімаці,
Хто даў табе найменне й шал?
Нашто так умела
Губамі лашчыш карал?
Усё ўва мне затрымцела.

* * *

О, двойца начных матылькоў
Стамілася да нематы.
Кветкі хагі гараць дакорам.
Разам з апраткаю ты
Скінула сорам.

* * *

Набрыняла барвянае неба
Навальніцай вясны наўкол.
Ластаўкі круг закруглілі пашанай,
Ах, як цяжэ нефрытавы ствол
У пальцах каханай.

* * *

Чарада апошняя
Адляцела ў знямозе.
Крумкач учарнеў з дакукі.
Апусціліся на каго ў дарозе
Твае пералётныя рукі?

Плакат

Ні жарты д'яблавы,
Ні землятрусы
Да дзён чаканых
Не з'іначаць след.
Пакуль на свеце
Будуць беларусы,
Па-мудраму
Багаты будзе свет!..

* * *

Страху няма рахубы
Пераходзіць дарогу дню.
Полымя
Апякае тонкія губы,
Смакуючы цішыню…

22.IX.2013

* * *

Галодны вецер у полі сумуе.
Памінаючы лета,
Дзьмухаўцовая свечка гарыць.
Роспач,
Шкадуючы сябе самую,
Хацела б са знікласцю
Загаварыць…

23.IX.2013

Віраток

Сёлета
Сваё ўзгадала ўчора.
Сёння ўзважвае,
Ці затрымацца варта.
Кропля
Выцінаецца бадзёра
З леташняга заўтра…

27.IX.2013

* * *

Агонь глядзіць на дрэвы —
Бачыць дровы.
Адлезе ў снезе
Сніца крыгалом.
На хутары маленства
Дрэмлюць совы.
Вятрак нагрэўся ўсмак
З адным крылом.

Я цішыню
Даверу крыгалому.
Сівому ветраку
Падам руку.
Знянацкаму
Дам тэлеграму грому,
Каб не спалохаў
Сонную раку…

24.XII.2012

* * *

Хто сказаў, што ў гэтым жыцці
Толькі раз мы былі маладымі?..
Су Дун По

Мы былі маладымі,
Калі
Зоркі,
Быццам пчолы ў вуллі,
У нашых душах
Святочна звінелі.
Мы, каго
Вочы жарсці ўраклі.
Мы, што з ранішніх вуснаў
Смагу пілі
Ад дазволу
Супроць забароны
Хмялелі…

P. S.
Кожны раз,
Затаіўшы дых,
П'е жыццё за нас
Маладых…

26.VII.2013

* * *

Свой век
Дажываю таропка…
І ўжо на стол
Пазірае куцця.
Дзе ты,
Залатая кропка
Стомленага жыцця?


3.VIII.2013

ФРАГМЕНТЫ

ЯНУШ РАДЗІВІЛ

СТАРОНКІ З НОВАГА ГІСТАРЫЧНАГА РАМАНА

Кастусь ЦВІРКА



…І вось Альгердаў трыумф — жаніцьба з Канстанцыяй.

Усе вясельныя абходзіны — і сватанне, і вянчанне ў царкве ў Слуцку, і банкетаванне ў доме маладой, маладога — былі для Альгерда як нейкі дзівосны сон. Няўжо гэта праўда, што Канстанцыя — такая мілая, такая любая, такая гожая, ні з кім не параўнальная — будзе цяпер яго жонка, будзе з ім заўсёды? Кожны дзень, кожную хвіліну? І ўсе-ўсе гады, усё жыццё?..

Пасля высокіх тостаў, віншаванняў, песень у гонар маладых, пасля традыцыйнага каравая далі слова музыкам — знакамітай слуцкай капэле, якая іграла ўсе самыя важныя навакольныя вяселлі. Тоненька пілікала, брала за душу скрыпка, зладжана гулі цымбалы, выспеўвалі на розныя галасы дудкі, звонка, урачыста выгаворваў сваё трамбон, весела пашалёствалі шамкі бубна.

Зазыўная музыка проста падмывала ўсіх у скокі. Першы танец — урачысты вальс — прызначаўся, як казаў звычай, для маладых. Усё застолле дружнымі воплескамі запрасіла іх у танец. Тут жа, пры сталах, было адведзена для гэтага належнае месца. Альгерд беражна ўзяў пад руку Канстанцыю і вывеў з-за сталоў.

Хвалі музыкі лёгка падхапілі іх, укруцілі ў свой радасны вір. Яны кружылі пад несціханыя ладкі ўсіх вясельнікаў, якія, пастаўшы, узялі іх у шчыльнае кола. Нельга было не залюбавацца гэтай парай — чароўнай, нябеснай красы маладой у лёгкім белым вэлюме і ў меру высокім, у добра падагнаным гарнітуры, не менш прыгожым і статным маладым. І толькі калі маладыя прайшлі свае кругі, да іх пачалі далучацца і ўсе тыя, хто хацеў іх падтрымаць…

Музыкі гралі не спыняючыся. Вяселле ішло поўным ходам. І от у самы яго разгар у дзвярах неўпрыкметку паявіліся два незнаёмцы ў дарожным убранні. Нікім не заўважаныя, яны моўчкі глядзелі на шчаслівую вясельную завіруху.

Асталіся нерухомымі яны і тады, калі, натанцаваўшыся, вясельнікі ізноў пачалі рассаджвацца за сталы.

Стоячы з Канстанцыяй на покуці і чакаючы, пакуль пасядуць усе, Альгерд і ўбачыў іх. Ён памкнуўся ўзмахам рукі запрасіць за сталы і іх — думаў, што гэта нехта з боку маладой. Але, угледзеўшы, аж усклікнуў сам сабе ад здзіўлення:

— Божа, гэта ж ганцы князя Януша Радзівіла!

Аднаго з іх Альгерд ведаў. Гэта быў Міхалка Падаляка.

Папрасіўшы ў Канстанцыі прабачэння, Альгерд працiснуўся між гасцей і падышоў да ганцоў, пададроўкаўся з імі.

— Што здарылася, хлопцы?

— Здарылася, ваша светласць, — адказаў Міхалка. — Вайна.

— Вайна? — пахаладзеў Альгерд. — З кім вайна?

— З Масковіяй, ваша мосць. Цар Аляксей Міхайлавіч ідзе на нас з войскам. Гетман Януш Радзівіл збірае ўсіх на вайну. — І, пакапаўшыся ў кішэні, працягнуў Альгерду паперыну.

Гэта была позва ад князя Януша Радзівіла: яму, ад'ютанту гетмана польнага Альгерду Урбановічу, загадвалася неадкладна прыбыць у Вільню, дзе на аўторак прызначана ваенная рада. Альгерд прыкінуў, што, каб туды паспець, яму трэба выехаць з дому ўжо заўтра раніцай! Вось дык сюрпрыз! Значыць, яму пасля вянчання выпадала пабыць з жонкай толькі адну шлюбную ноч!

З сябрамі-ганцамі, якіх таксама запрасіў у застолле, Альгерд вароччаўся на сваё месца зніякавелы, апанураны. Што рабіць? Пакуль што змаўчаць пра вайну, каб не псаваць людзям свята? Ды ўсе глядзелі на яго з допытнымі вачыма: добра ўбачылі яго збянтэжанасць.

— Што там такое, пан Альгерд? Што здарылася? — пасыпаліся з усіх бакоў запытанні.

І ён мусіў сказаць вяселлю пра вайну. Што на яе загадана збірацца і яму.

Для вясёлага застолля гэта было як гром сярод яснага неба. Усе мігам працверазелі.

Вяселле, якое на радасці завінулася гуляць цэлы тыдзень, згарнулася ўмомант…

Па Маскве шырокімі хвалямі разліваюцца меладыйныя гукі да адказу раскалыханых званоў. «Дзнн-дзнн-дзнн» — нясецца з усіх, якія толькі ёсць, цэркваў і сабораў. Гукі званоў запаўняюць усе пляцы і вуліцы, плывуць у двары і падворкі, тоўхаюцца аб вокны і сцены каменных дамоў і драўляных хацін, трывожна і соладка адгукаюцца ў людскіх душах. Мяшчане кідаюць пачатую работу і барздзжэй бягуць на вуліцы, спяшаюцца да чырвонага ад цэглы Крамля: што зрабілася, што ўчынілася?

А там, на галоўным пляцы стольнага горада Масковіі — мора людзей.

Адтуль у шырокую вуліцу, што вядзе на захад, бясконцай ракою плыве грукатлівае войска. Калышуцца пікі коннікаў, паблісквоюць стальныя ствалы мушкетаў і шабляў, грукочуць аб брук колы абозу.

Абодва бакі вуліцы абступілі людзі, асяняюць, нізка кланяючыся, крыжамі. А святары акрапляюць войска яшчэ святою вадою, блаславяюць на ратныя подзвігі.

Больш спрытныя маскоўцы яшчэ раніцай працiснуліся бліжэй да крамлёўскіх варот, пры якіх на высокім дашчаным рундуку, акрытым чырвоным сукном, стаяў сам цар Аляксей Міхайлавіч Раманаў у сваім бліскотным адзенні, у зіхоткай шапцы Манамаха і са скіпетрам у руках. З чорнай барадкай клінком, чырванашчокі. А з ім, па правую руку, у гэтакай жа зіхатлівай ад дарагіх камянёў рызе таптаўся патрыярх Нікан.

Калі да варот падышла царская конніца, яе камандзір загадаў ёй спыніцца. А сам саскочыў з каня і, нізка кланяючыся цару, пачаў нешта дакладваць. Цар Аляксей Міхайлавіч маладым, яшчэ не агрубелым, нават трохі па-хлапечы танклявым голасам прамаўляў войску свой наказ на дарогу:

— Мы, вялікі гасудар усяе Русі, папрасіўшы ў Госпада Бога і найсвяцейшай Багародзіцы спрыяння, добра параіўшыся з свяцейшым патрыярхам Ніканам, — пры гэтых словах цар павярнуў да яго галаву, — дый з усім асвячоным саборам, з баярамі, акольнічымі, думнымі людзьмі, пастанавілі ісці вызваляць ад ганенняў і здзекаў увесь народ праваслаўны, каб сабраць усіх авец божых разам з іхнімі землямі пад нашу царскую руку, да аднаго пастыра — патрыярха Масковіі Нікана. На вялікую святую справу дабраслаўляем мы вас, ратныя людзі. Каб выканалі божае наканаванне, каб прыўмножылі і пашырылі гаспадарства наша маскоўскае…

Услед за царом узнёсла і лепна гаварыў патрыярх Нікан:

— Ідзіце ж, дзеці мае, радасна і дзерзасна ваяваць за святыя цэрквы божыя, за адданага Богу гасудара нашага, за ўсіх хрысціян праваслаўных! Выконвайце ж гасудараву волю без усякага сумніву, не шкадуючы жывата свайго. На святое дзела благаслаўляем мы ўсіх вас, слаўных ратаборцаў маскоўскіх. На вас — усёй Русі нашай упаванне… Мы, патрыярх царквы нашай праваслаўнай, усе слугі Божыя, настаўляем вас не шкадаваць ворагаў маскоўскага гаспадарства нашага, усіх, хто працівіцца волі гасудара нашага. Смерць усім няверным! Усім тым, хто не хоча ісці ў лона царквы нашай праваслаўнай, пад цёплае крыло вялікага гасудара нашага. Аддадзеныя смерці за супраціў цару нашаму — гэта будуць нашы ахвяры ўсёмагутнаму Богу, які хоча, каб усе людзі на зямлі правільнай дарогай ішлі па ласку яго. Недругі нашы — гэта камяні, што ляжаць на дарозе перамогі веры нашай праваслаўнай, веры дзядоў і бацькоў нашых, — і вы павінны прыбраць камяні гэтыя з дарогі нашай. Ідзіце ж смела біцца з нявернымі, ачышчайце зямлю славянскую ад схізмы, ад паганай нечысці…

А трыма днямі пазней, 18 мая 1654 года, Масква ўрачыста праводзіла на вайну і самога самадзержца Русі Аляксея Раманава. Пазалочаная царская карэта, запрэжаная васьмірыкам, злёгку пагойдваючыся на жалезных рысорах, плаўна каціласа па добра ўезджанай смаленскай дарозе. Уперадзе і ззаду цокала капытамі дваровая конніца Аляксея Міхайлавіча, што ахоўвала свайго гасудара ад усякіх нечаканасцяў.

Па дарозе з Оршы, пырскаючы шматкамі зямлі з-пад капытоў, спорнай рыссю скакаў невялікі аддзел добра экіпіраваных коннікаў. Вёў іх князь Альгерд Урбановіч.

Раніца была хмурная, без сонца. Спярша пробаваў сеяцца дробны лянівы дожджык. Ды ён папырскаў, папырскаў і — перастаў.

Па баках, да палоскі далёкага, асмужанага туманам лесу, распасціраліся палявыя разлогі з зялёнай, добра ўрунелай ужо збажыной, па лугавінах купчасцілася лазовае ды ракітавае кустоўе.

Ранішні халадок добра падбадзёрваў Урбановіча. У галаве круціліся думкі пра яго місію. Якое б гэта было шчасце для тысяч людзей, калі б знайшлося паразуменне з Багданам Хмяльніцкім і каб ён разарваў пераяслаўскую дамову з Масквой. Гэта ж калі б украінцы з саюзнікаў зрабіліся праціўнікамі маскавітаў — ці ж асмеліліся б тыя ісці вайной на Рэч Паспалітую ды Княства? У кожным разе значна лягчэй было б тады ўсім разам абараніцца ад маскоўскага нашэсця.

Да Чыгірына, дзе павінна быць рэзідэнцыя Багдана Хмяльніцкага, дарога немалая: скакаць ды скакаць. А на ёй усякае можа здарыцца ў гэты неспакойны час. Мо з кім і загрудкі давядзецца ўзяцца. Ды лепш за ўсё пазбягаць усякіх боек. Галоўнае — выканаць місію. Толькі ж ці ўсё прадугледзіш?

Каманду сабе Урбановіч падабраў, здаецца, неблагую. Апроч вернага Цішкі Нячая скакалі побач з ім каржакаваты, моцны, як корч, Габрусь Зязюля, вёрткі, што той вуж, Янка Парахневіч і мажны, шыракаплечы здаравіла Максім Бурак, увесь рыжы, з чырвоным тварам, што вельмі адпавядаў свайму прозвішчу. Ва ўсіх — па дзве пісталі ды шаблі пры боку.

З вялікай ахвотай згадзіўся ехаць Альгерд Урбановіч ва Украіну і яшчэ з адной прычыны: гэта ж па дарозе, хоць трохі і ўбаку, яго родныя мясціны, і ён спадзяваўся нехяк заскочыць да сваіх, да любай Канстанцыі. Пры адной думцы пра яе ў Альгерда кожны раз мацней білася сэрца.

Дарога ішла то полем, то лесам. Амаль увесь час імчалі рыссю: трэба было спяшацца. Нанач спыняліся ў гарадах і мястэчках. Начлег забяспечваў спрытны Цішка. Знаходзіў начальства, паказваў ахоўную грамату ад вялікага гетмана Януша Радзівіла, і важнае пасольства заўсёды мела месца для адпачынку.

Горш было ва Украіне. Там з падазронасцю глядзелі на паслоў беларускага гетмана, які добра даўся ў знакі ўкраінскім казакам.

Пры ўездзе ў Чыгірын на добрую паўднёўку затрымала пасаоў варта. Яе начальнік — высокі казак з адвіслымі вусамі, з доўгой пасмай валасоў на выбрытай галаве і… з абрубкам правай рукі — апроч ахоўнай, патрабаваў і пісьмо да Багдана Хмяльніцкага. Альгерд Урбановіч сказаў на гэта, што ён павінен з рук у рукі перадаць яго адрасату. Тады аднарукі начальнік загадаў пасольству пачакаць у загарадцы пры вартаўнічай будцы. Калі паслы ўехалі туды на сваіх конях, ён зачыніў за імі вароты і ўзяў іх на замок.

— Да Багдана Хмяльніцкага, — сказаў ён праз дашчаныя вароты, — я адпушчу вас толькі тады, калі прыйдзе кат з сякерай і паадсякае кожнаму з вас па правай руцэ. Так, як мне адсек ваш Радзівіл.

Паслы добра ведалі, як усё гэта было. Калі чатыры гады назад казацкія загоны Хмяльніцкага пайшлі на Беларусь і пачалі разбойнічаць: граміць і рабаваць гарады, сёлы ды шляхецкія маёнткі, біць і паліць, секчы шаблямі ні ў чым не вінаватых людзей, вешаць і садзіць на калы, тады і Януш Радзівіл, ваюючы з імі, гэтак жа жорстка караў найбольш зацятых і бязлітасных казакоў-гвалтаўнікоў. Так, калі войска Радзівіла пасля доўгіх крывавых баёў адвальвала захопленны казакамі Мазыр, які яны залілі крывёю, здзекуючыся з людзей, беларускі гетман загадаў жорстка расправіцца з найбольш актыўнымі ды паланёнымі ўжо казакамі. Тады дзевяць з іх былі пасаджаны на кол, некалькі дзясяткаў засеклі шаблямі, а некалькі сотням адсеклі правую руку — каб болей не маглі ўзяць шаблю і нападаць на Беларусь.

І хіба ж мог забыць казацкі начальнік варты гэтакую крыўду?

У двары Урбановіч апанурана тупаў каля каня. Ён добра ведаў, што ў казакоў былі свае законы, а лепш сказаць, яны не трымаліся ніякіх законаў. І пакрыўджаны беларусамі казак мог вельмі лёгка выканаць сваю пагрозу. Цікава, колькі загойвалася б тады ў Альгерда Урбановіча рука? Яго місія яўна зацягнулася б. А мо і зусім не змог бы тады сустрэцца з украінскім гетманам. Дзіўна, толькі за гэта, а не за сваю руку найперш перажываў пасланнік Януша Радзівіла.

Са скрухай глядзеў ён праз плот, як снавалі туды-сюды казакі, пешыя і конныя, як, сабраўшыся разам, рагаталі, пра нешта расказваючы, як, жартуючы, дужаліся адзін з адным. Гэта ж так недарэчна ўліпла беларускае пасольства ў самым канцы дарогі. Хто ведае, ці не перашкодзіць гэта наладжванню міру, нейкаму разумнаму пагадненню?

Як бы там ні было, Альгерд Урбановіч са сваімі памагатымі так лёгка не дасца ў рукі нахабнікам, калі яны і праўда ўздумаюць чыніць над імі якую экзекуцыю.

З роспачу глядзеў князь, як усё ніжэй і ніжэй апускалася сонца: гэта ж так марнуецца дарагі час.

Невядома, колькі б той аднарукі трымаў у загарадзі паслоў і што ўчыніў бы з імі, калі б не наскочыў на кані казацкі палкоўнік Іван Багун.

— Хто такія? — убачыўшы незнаёмых, папытаў у аднарукага.

Сумеўся быў начальнік варты, ды мусіў прызнацца.

Даведаўшыся ад Урбановіча пра мэту пасольства з Беларусі, Багун загадаў паслам ехаць за ім. Ён памог уладкаваць іх на начлег, а назаўтра наладзіць сустрэчу з Багданам Хмяльніцкім.

Украінскі гетман прыняў Альгерда Урбановіча ў сваім кабінеце вельмі стрымана. Як сядзеў у крэсле за шырокім дубовым сталом, так і не прыўзняўся насустрач. Толькі зірнуў на яго знізу ўверх і прапанаваў сесці насупраць. Прачытаў пісьмо Януша Радзівіла, пакруціў яго ў руках і адклаў убок.

— Хоць мы з Янушам Радзівілам, — памаўчаўшы, пачаў разважліва Хмяльніцкі, — адзін час былі парадненыя праз дачок малдаўскага гаспадара — адна стала Янушавай жонкай, а другая — жонкай майго сына Цімафея, але сустракацца не вельмі нам выпадала. Добрую гутарку меў я з ім на сустрэчы з каралём Янам Казімірам, з якім было ў мяне якраз прымірэнне. Мушу сказаць, чалавек вялікай волі ваш гетман. Рашучы і непахісны. Ну, і палкаводзец — якіх толькі пашукаць. Выдатны палкаводзец, добра біў і маіх палкоўнікаў. Ну а што канкрэтнае прапануе мне мой былы сваяк Януш Радзівіл?

— Самае галоўнае — разлучыцца з Масквой…

— І злучыцца з Рэччу Паспалітай?

— Так і не так. Януш Радзівіл хоча, каб Украіна была самастойнай дзяржавай у Рэчы Паспалітай, поўнай аўтаноміі ў нашай федэрацыі. Як цяпер Беларусь — Вялікае Княства Літоўскае. Са сваёй казной, са сваім войскам, з забаронай палякам умешвацца ў нашы ўнутраныя парадкі, сяліцца ў нас палякам.

— І Януш Радзівіл верыць, што кароль, палякі дазволяць гэта і ва Украіне?

— Калі б ваша вялікасць дала на гэта згоду, наш вялікі гетман паставіў бы пытанне на вальным сойме Рэчы Паспалітай, угаварыў бы яго паслоў і караля адмовіцца ад сваіх прэтэнзій на Украіну. А гарантыяй быў бы наш цесны саюз паміж сабой — саюз Украіны з Вялікім Княствам, нашай беларускай дзяржавай. Мы разам абаранялі б нашы правы ў агульнай федэрацыі. І абаранілі б, бо, злучаныя разам, мы былі б мацнейшыя за Польшчу. І тэрыторыяй мы намнога большыя за яе. Значыць, і паслоў нашых на соймах было б болей. А яны не далі б нас у крыўду.

— Усё гэта так. І я думаў пра гэта. Ужо і дагавор пра Казацкую дзяржаву ў Рэчы Паспалітай быў падпісаны з палякамі. Ды хіба ж хацелася ім выконваць яго? Такі хаўрус, такую федэрацыю праектаваў і мой генеральны пісар Іван Выгоўскі. Хацеў, каб Рэч Паспалітая была не дзяржавай двух народаў, польскага і беларускага, а трох — польскага, беларускага і ўкраінскага. Каб у гэтай федэрацыі былі тры раўнапраўныя дзяржавы: Польскае каралеўства, Вялікае Княства Літоўскае (дзяржава беларусаў) і Рускае княства (украінская дзяржава). З усімі гарантыямі. Нават гаварылася пра гэта з польскімі саноўнікамі. Ды тыя адразу ж насы адваротвалі, не хацелі і слухаць пра такое.

— А ўсё ж палякаў можна перапканаць, — не адступаў ад свайго Урбановіч. — Тады б ім не трэба было ваяваць з вамі, украінскімі казакамі. Ды і з усякай вайною было б скончана. Бо Масковія мусіла б тады вярнуць да сябе свае войскі.

— Я не веру палякам, — сказаў Хмяльніцкі, і ў вачах яго блiснулі злыя іскры. — Яны не раз падманвалі мяне. Ды ці ж захочуць яны выпусціць з рук такую запаветную зямлю, як Украіна? Колькі ж іх тут глыбока пусціла свае карані. Хай не будзе такі наіўны Януш Радзівіл.

— Ну, а калі ён усё ж даб'ецца гэтага?

— Не даб'ецца! Але хай пробуе. Калі выйдзе што, хай выпраўляе да мяне новае пасольства. Паглядзім, якія там будуць гарантыі. Ды нічога добрага ад палякаў я не чакаю.

Памаўчалі. Кожны думаў пра сваё.

— А яшчэ ў нас ёсць другі план. Не будзем толькі казаць, ад каго ён зыходзіць. —Урбановіч бліжэй падсунуўся да гетмана. — Зладзіць хаўрус, можна сказаць, сепаратны хаўрус Вялікага Княства з Украінай. Аб'яднацца украінцам з беларусамі. Каб нашы братнія народы былі заадно. Тады б разам пашукалі яшчэ хаўруснікаў. Калі б заручыцца падтрымкай Швецыі на поўначы ды Малдавіі і Крыма на поўдні, то мы маглі б любога ворага ўціхамірыць.

— Так от яны і кінуцца нам памагаць. Усё гэта сны, трызненні, шаноўны пан пасол і гетманаў дараднік.

— Каб сны спраўдзіліся, трэба з нечага пачынаць, ваша вялікасць. Найперш — гэта разарваць хаўрус з Масковіяй. Маскоўскі цар не дазволіць украінцам ніякай аўтаноміі. Паабяцаць паабяцае, а як прыйдзецца — назад свае ж словы. У яго палітыка адна: кось, кось — і ў аглоблі.

— Ну, гэта ўжо мне ведаць, якая ў маскоўцаў палітыка і якая ў нас мэта.

І ўсё ж нейкі цень прайшоў па чале Хмяльніцкага, вочы ў яго прыжмурыліся, галава нахілілася: задумаўся.

— То што вы маеце перадаць Янушу Радзівілу, пан гетман? На чым мы пагодзімся?

— Хай Радзівіл сам падумае…

Перамовы кончыліся нічым.

…Прачнуўся Януш Радзівіл сярод ночы. Ад дажджу, ціхага, вельмі спакойнага дожджыку, што неяк лена сеяўся з неба, пырскаючы проста ў твар: князь ляжаў на спіне. Дзе ляжаў, ён сам не бачыў: было цёмна — хоць выкалі вока. Хацеў устаць, прыпадняўся ўжо на локці, але ад рэзкага болю ў плячы зноў апусціўся долу. Ляжаць было мякка: здаецца, ён апынуўся на нейкай узвышанай лугавіне, на густым сіўцовым куп'і.

Пачаў перабіраць у памяці, як усё было, што з ім сталася. Ды апроч суцэльнага гулу-лязгату бітвы, у якую ён кідаўся, мала што прыходзіла ў галаву. Нават калі таўханула ў плячо чыясьці піка, ён, не зважаючы на боль, не спыняўся ў сваім лёце на кані. Ведаў адно: яму трэба было трымацца да канца. Бо з яго бралі прыклад, ён быў як сцяг для ўсяго беларускага войска. Зрэшты, яго белы атласны жупан, на які прасачылася і пацякла чырвонай паласой кроў з раны, і быў падобен на сцяг. Не, не белы сцяг капітуляцыі, а афарбаваны ваярскай крывёю сцяг змагання.

Помніў, што пад ім два разы падалі коні і яму падводзілі новых. Адзін момант у бітве быў асабліва крытычны, асабліва небяспечны для самога Радзівіла. Гэта калі перад самым носам зусім нечакана вырас на ўздыбленым кані нейкі мажны маскоўскі гусар. Януш Радзівіл згледзеў краем вока, як бліснуў над галавой высока ўскінуты меч. «Усё!» — толькі і паспеў падумаць вялікі гетман. Ён нават уцяў ужо ў плечы галаву, чакаючы канца. Ды ў самы апошні міг паміж ім і тым маскоўскім грамілдам раптам узнік свой, з гетманскай харугвы ратнік, меч якога і скрыжаваўся з мечам маскоўскага конніка. Конь Януша Радзівіла скочыў убок, і гэта выратавала князя ад немінучай, здавалася, смерці. Не ўцалеў толькі яго выратавальнік — харунжы Глафенберг, якога адолеў-такі маскоўскі асілак. Цаной уласнага жыцця радзівілаўскі ваяр выратаваў вялікага гетмана.

Але самым балючым было для Януша Радзівіла бачыць такі нечаканы разгром свайго войска, бязладныя ўцёкі з поля бою яго жаўнераў пад шырокай лавінай маскоўскай конніцы, якую ніяк нельга было стрымаць меншымі сіламі.

Потым была паспешлівая пераправа рэштказ беларускага войска праз Друць, дзе яго ваяроў насцігалі і бязлітасна секлі маскавіты.

Разгром! Страшэнны разгром яго войска. І ўсё гэта яму трэба перажыць.

Аставалася толькі надзея, што не ўсе яго ваяры палеглі ў той трагічнай бітве, што многіх уратаваў блізкі лес. Ведама ж, шмат каму ўдалося ўцячы. І яны вернуцца, каб уліцца ў сваё потым адноўленае войска.

Ды толькі от што рабіць цяпер яму, вялікаму гетману, у чыіх руках кіраўнічыя лейцы абароны краіны, як выбавіцца адсюль, параненаму, са скалечанай нагой? Добра, што конь занёс яго падалей ад крывавага поля бою. Толькі ж дзе ён дзеўся, той конь?

Доўга ці мала ляжаў ён у паўзабыцці, ды калі расплюшчыў вочы, пачынала світаць. Перад ім вырысаваліся цьмяныя сілуэты кустоў. Асцярожна прыўзняўся на локці. Мутным святлом налівауся ў адным баку край неба: ага — там усход. Значыць, яму трэба прабірацца ў іншы бок, на захад. Стараючыся не рабіць рэзкіх рухаў, устаў і паволі пачаў перасоўваць ногі, хоць на адну, левую, няможна было ступіць: яе праціпаў няўцерпны боль. Прыскакаў на адной назе пад блізкі хмызняк і сваёй вострай шабляй, якая аказалася пры ім у похве, ссек і ацерабіў бярэзінку — зрабіў сабе кій. Апіраючыся на яго і абмінаючы густы хмыз, пакульгаў уперад…

Ішоў доўга, раз-пораз сунімаючыся, каб паесці ягад — брусніц, чарніц, буякоў, нават суніц траплялiся. У адным месцы нарваўся на кусты арэшніку, добра натачыў зубы амаль паспелымі ўжо арэхамі, хоць трохі ўлагодзіў імі жывот.

Раптам уперадзе, трохі збоку, пачуўся нейкі гул. Гул не гул — прыглушаны лесам многагалосы людскі крык. Што ж гэта?

Прыспешыўшы хаду, скіраваў туды. Немы крык узрастаў, раздзіраючы душу. Запахла дымам. Пажар?..

Спачатку паказаліся каровы. Іх гналі даўгімі дубцамі маскоўскія жаўнеры. Цэлая чарада кароў. Следам за жывёлай цяжка рыпелі, ляскочучы па выбоінах, нечым важкім наладаваныя сялянскія калёсы. Вазоў было многа — цэлы абоз. Царскія жаўнеры ішлі збоч, трымаючы лейцы. Калі прарыпела апошняя падвода, паказалася нешта зусім дзіўнае. Салдаты гналі натоўп людзей. Маладзенькія дзяўчаткі, нестарыя жанчыны, маладыя хлопцы, падлеткі. Ну, так — у рабства гналі. І добра, калі ў Масковію. А то ж прадавалі такіх палонных на ўсякіх рынках. Купцам з Турцыі, з арабскіх краёў. Калі хто вытыркаўся з людскога натоўпу, канваіры білі плазам шаблямі ці прыкладамі мушкетаў. Нейкая жанчына з распушчанымі валасамі, галосячы на чым свет, пачала рваць на сабе валасы, махаць рукамі ды выкрыкваць праклёны. Салдат-канваір з размаху сякануў па ёй шабляй...

Януш Радзівіл ляжаў у кустах, пакуль абоз лютых маскоўскіх рабаўнікоў не знік з вачэй. Тады ён устаў і, апіраючыся на палку, пакалдыбаў туды, адкуль усё яшчэ плыў, расцякаючыся па полі і заходзячы ў лес, разрэджаны чорны дым.

Жудасная карціна адкрылася перад вачыма Януша Радзівіла, калі ён пайшоў на дым. Туды, дзе была вёска. Так, была. Цяпер ад яе асталіся адны галавешкі. На месцы хат, сцены якіх яшчэ дагаралі, нібы якія помнікі, тырчалі напаўразваленыя коміны. І ўсюды ляжалі пасечаныя шаблямі людзі, амаль усе старыя і дзеці. Ясна: у палон такіх маскоўскія акупанты не бралі — каму яны патрэбныя. Вунь у расхрыстанай белай кашулі, залітай крывёю, мажны дзядуля з вялікай белай барадой. Побач — маленькае дзіцянё без галавы. На тым баку вёскі яшчэ дагарвала, курэла густым чорным дымам чыёсьці вялікае гумно. Там кінуліся ў вочы цэлыя груды абвугленых людзей. Як відаць, іх спалілі ў тым гумне жывымі. От адкуль, значыцца, даносіўся той жудасны многагалосы крык. Што тут скажаш, маскавіты дзейнічалі па прынцыпе: не перадушыш пчол — не дастанеш мёду.

Пастаяў вялікі гетман зямлі беларускай каля закатаванай вёскі і памалу рушыў далей. Шукаць жывых людзей…



ПАРЦЭЛЫ

З КНІГІ «ІЕРОГЛІФЫ ЛЁСУ»

Алесь МАКРАЦОЎ

***

Калектыў
з сябе выціснуў
упартую кроплю:
адзінотніка…

***

Нізка
парцэл…
Струк
фасолі…

***

Вузкая
каляіна
жыцця…
Адзінота.

***


Пагаслая
зорка…
гарбузовага
квету…

***

Падушачкі
мамы
вышытыя
пачуццямі…

***

Жанчыны…
перадаюць
жыццё…
З рук на рукі.



***

Склад
мовы жыцця:
ён зычны,
яна галосная…

***

Зламанае
матавіла…
вялікай
сухой яліны…

***

Шура —
маё цела.
Дух мой —
Алесь…

***

Царства
Божае
ў душы
чалавека…

***

Лёгка
ехаць дамоў,
каб цяжка
вяртацца…

***

Мяне
паменшала:
стала болей
цябе…

***

Вызваленне
«заходнікаў»…
ад сала
і каўбасы…

***

Помнік
чэкістам…
Ва ўрочышчы
Курапаты…

***

Разгон
дэманстрантаў…
На жаночай спіне
адбітак
бота дзяржавы…

***

Да мовы
стаўленне
як…
да апазіцыі…



Фота В. Казакова

***

Прытуліўся
да хаты…
Птушаня
пад страхой.

***

Квецень
ліпы…
Пчаліны
ліхтар…

***

Ігла-
тэрапія
лясной
заедзі…

***

Залева…
Паміж ялін
лісічкі
палаюць…

ВЕРШЫ

ПАЗНАКА ЛЁСУ



Фота У. Клімовіча

Алесь КІРКЕВІЧ



***

Гэта горш за адсідку ці здраду сябра,
Горш за выбарчы фарс,
Горш за жыццё паперы й асадкі,
Горш за вайну для Вас.

Гэта як быццам калені ў снезе
І яма перад табой.
І зараз мазгі заменяцца ў месіва,
Жылы — у перагной.

Смех за спіной ды жарты расейскаю.
Б'е ў пустэчу баёк…
Іней бяроз, запальнічкі крэсіва —
Ды рухавік шчэ не змоўк.
…Словам сваім, у сац-сетках адточаным,
Так жа выпальваў ушчэнт,
Быццам па хмарах мы ўчора не крочылі,
Зораў задраўшы тэнт.

Зорная

Пазнака лёсу на ілбе.
Папераменняззяюць зоры.
Тваіх вачэй прастора мне
Дрыгву ператварае ў мора.

І вочы колеру дрыгвы
Дрыжаць, нібы на небасхіле.
Падымеш голаў — разам МЫ
У зорных сферах, не ў магіле!

***

Ці напішаш мне першая
Вершам
Ці, можа, прозай?
Ты можаш па-рознаму.
Ведаю,
Паклічаш мяне на сустрэчу,
Як цемра апусціцца вечарам.
Ведаеш… цемру —
Перамагаюць свечкі!
Яны былі б сёння дарэчы
У нашым зямным раі...
«Ведаеш?»
«Ведаю...»

***

Рывок наперад долі-баязлівкі —
Тым больш рашучай, чым менш шансаў
на жыццё.
Цяжарнай перамогай, абцяжаранай
прапіскай,
А пад прапіскі штампам — сэрцава біццё.

Дамокл не вытрымаў, а меч упаў:
Без працы сёння не застанецца Харон.
Пасаду нехта страціў, нехта — мовы дар,
Калі выносілі на задні двор
з палацу трон…

ДЗЁННІК

ДВАЙНЫ КРЫЖ

Алесь ГІБОК-ГІБКОЎСКІ



Дылема: Божы Закон — Грэх…

Быццам бы ясна — трэба жыць па Божым Законе. Але маючы стасункі з іншымі людзьмі, немагчыма пазбегнуць граху хоць у якой праяве. Разумеючы гэта, мы часта дыстанцыруемся ад соцыума. Як вынік — самота, якая сама па сабе вядзе да аднаго з самых цяжкіх грахоў — маркоты.

З пачутага: «У Бога ўсе жывыя!» Наўрад ці ўвогуле можна сказаць лепш!..

Джын — Аладзіну («Казка пра чароўную лямпу Аладзіна»), пасля атрымання загаду знішчыць апошняга: «Я — твой сябар... Але я — раб Лямпы!..»

Ці не гэтая дылема ёсць адной з самых папулярных у нашым сумным жыцці?..

Для нас, мужчын, усё ў жыцці пачынаецца і завяршаецца ў жанчыне. Яна нараджае нас на свет, у ёй мы і паміраем. Не тады, калі фізічна, а тады, калі яна ў нейкі момант не выбірае нас…

Ад лабавых атак інфернальнага нас здольныя абараніць толькі сапраўдная вера і сапраўднае каханне.

Улада, як прынцып чалавечых стасункаў — як правіла, даволі заганная рэч, бо ўтварае своеасаблівую эгіду ўсіх астатніх заганаў: маны, крывадушша, нізкапаклонства, ханжаства, подласці і інш.

«Узяць» — звычайны хватальны інстынкт, уласцівы кожнай жывёліне, а вось «аддаць» — гэта выключна чалавечая рыса, а, хутчэй, нават талент, уласцівы, на жаль, далёка не кожнаму з нас.

Багаты сябра рана ці позна здрадзіць беднаму, бо той заўсёды яго «напружвае» сваімі праблемамі. Нездарма Канфуцый раіў выбіраць сяброў толькі са свайго кола.

Той, хто не здольны любіць, наўрад ці здольны і разумець.

Зважаць на чужыя пакуты мы пачынаем толькі тады, калі напоўніцу спазналі свае.

Нягледзячы на сённяшнюю ўніверсалізацыю і масіфікацыю пісьменніцкай творчасці, індывідуальны аўтарскі стыль, яго адметнасць і арыгінальнасць усё роўна будуць мець у перспектыве асабліва кошт, бо яны, уласна, і ёсць галоўнымі прыкметамі творчасці.

Як жа знайсці нам абрысы згоды, гармоніі ў сённяшняй густой (хоць вока выкалі!) цемры існавання ?

Рана ці позна ў жанчыны настае час, калі яна мусіць у сваіх адносінах з мужчынам кіравацца ўжо не пачуццямі, а розумам. І калі яго бракуе — расплатаю становіцца поўная самота.

Нашы пачуцці да чалавека — падмурак адносінаў з ім. А без падмурка дом не пабудуеш.

Утульную абалонку аўры дваіх стварае, як правіла, жанчына. Але напаўняе яе зместам — мужчына!

Прыгажосць і дабрыня ў нас не ад таго, што мы ведаем, а ад таго, у што верым.

Калі чалавек заўсёды знаходзіць апраўданне злу, якое творыць, то відавочна, што ён ужо моцна «прыжыўся» на інфернальнай дзялянцы, за што давядзецца плаціць вельмі дорага. Часам сваёй душой...

З прачытанага: «Без любові розум робіць чалавека хітрым, багацце — сквапным, выхаванне — двудушным, праўда — крытыканам, улада — гвалтаўніком, справядлівасць — жорсткім, гонар — высакамерным, ветлівасць — крывадушным»...

Усё так... Але далёка не ўсіх, на жаль, і любоў выпраўляе...

Мярзотнасць некаторых чалавечых душ можна прапускаць праз сябе і вытрымліваць толькі да таго часу, пакуль спраўляецца «фільтр» тваёй душы. Калі ён пачынае «дыміцца», трэба тэрмінова ратавацца ад такіх стасункаў, бо потым пачнецца непазбежнае запаўненне чужой цемрай і наўпростаае спажыванне непасрэдна тваёй жыццёвай сілы.

Самая непрыемная спадчына «ліхіх» 90-х — часоў, калі многія шчыра імкнуліся да сваёй дзяржаўнасці, дэмакратыі, нацыянальнай самаідэнтыфікацыі — квазідзяржаўнасць, квазідэмакратыя, квазінацыяналізм...

Добрая паэзія — найбольш дзейсны сродак духоўнага ўдасканалення чалавека, бо нясе — адрозна ад музыкі, жывапісу і іншых відаў мастацтва — яго канкрэтную слоўную праграму.

Чым меней чалавек у жыцці здзяйсняе — тым меншы шанц саграшыць. Але ў выніку на яго кладзецца цяжкі грэх бяздзеяння, які высмоктвае жывую сілу душы дашчэнту.

Інфантылізм у дарослага чалавека — адна з самых выбітных прыкмет інфернальнасці. Гэты комплекс сведчыць пра страх да рэальнага «дарослага» свету і моцны вэрхал у душы.

Найперш мы кляймім «звера» ў іншым чалавеку, замест таго, каб надзейна зацугляць яго ў сабе. Бо, не сакрэт, што ён ёсць у кожным з нас апрыёры.

Калі нітачка адносінаў між людзьмі рвецца з прычыны функцыянальнай некарыснасці, то яны не былі сапраўднымі.

Мы сёння амаль што перасталі запрашаць адзін аднаго ў госці. Запанаваў заходні ментальны тып: «Колькі ж гэта будзе каштаваць?». Таму і згубілі вельмі важны канал сувязі між сабой — зносіны.

Вынік — «Колькі ж гэта будзе каштаваць?..»

Нярэдка мы «выкрэсліваем» са свайго жыцця «нязручных» людзей ад уласнай слабасці, а то і нікчэмнасці, і тым самым моцна сябе абкрадваем, бо, як правіла, гэтыя «нязручныя» — Асобы.

Таму-сяму і на схіле жыцця не шкодзіць зрабіць капітальную «перазагрузку» сваіх духоўных і маральных каштоўнасцяў, бо як жа выразна выяўляюцца яны часам на твары.

Не можа быць нацыянальная палітыка ў кіраўніцтва краіны, калі начыста адсутнічаюць нацыянальныя прыкметы ўлады.

Сапраўдны вернік не можа патрабаваць любові да сябе. Ён хоча і імкнецца найперш любіць сам.

Восенню і зімой у адзенні большасці беларусаў выразна пануюць шэры і чорны колер. Яны даўно ўжо сталі амаль што нацыянальнымі колерамі. Асабліва ў асяродку аматараў «зялёнага змія».

З прачытанага: «Ёсць толькі адзін варыянт ашукаць лёс — цалкам адмовіцца задаваць яму негатыўныя імператывы, а зрабіць сваім перманентным сцягам стваральныя…» Але ў выніку мы ашукваем саміх сябе…

Колькі разоў даводзілася пераконвацца, што «вялікаросы», безадносна да іх чалавечых і маральных якасцяў і сацыяльнага становішча — абавязкова атручаныя комплексам «сада-маза». Ва ўсялякіх стасунках — асабістых, грамадскіх, эканамічных, уладных — яны апрыёры проста не здольныя суіснаваць гарманічна. Магчымыя толькі два варыянты : або «наверсе», або «пад» кімсьці... Адсюль і хранічная невырашальнасць ўсіх праблемаў у Расіі!

Схільнасць да палігаміі — найперш мужчынская рыса, закладзеная эвалюцыяй. Доўгі час яна была сродкам гарантаванасці ўзнаўлення роду ў часы крытычных страт у асяродку моцнага полу. Але сёння яна няўзнак стала адным са сродкаў вынішчэння чалавецтва, бо як і іншыя рысы амаральнасці, лье ваду на млын Антысістэмы, маючай за мэту паступовае знішчэнне ўсяго жывога на Зямлі.

Добрыя, нават выдатныя функцыянальныя здольнасці чалавека — не ёсць прычына яго любіць.

Вялікі грэх — захоўваць цэласнасць сваёй душы за кошт душы іншага...

Фармаліст і грахі ў сабе бачыць фармальна. А значыць, не ў стане ніколі раскаяцца шчыра, да канца, а значыць, вымушаны насіць у сабе цяжкі груз грахоў пажыццёва..

Добрая арганізацыя быту ў доме — паказальнік парадку і ладу ў душы яго насельнікаў, і наадварот.

Нашы беларускія праваслаўныя ў пытаннях сваёй веры нясуць сёння, бадай што, двайны крыж, спрабуючы злучыць часам незлучальныя ментальныя рэчы, звязаныя са знешнім антуражам іх веры.

Здольнасць «вяшчаць» праразаецца ў чалавека разумнага толькі ў сталым веку з набыццём сапраўднага жыццёвага досведу, а значыць, і каштоўнай жыццёвай мудрасці. Гэтым багаццем хочацца падзяліцца, але тады жадаючых яго слухаць застаецца ўжо вельмі мала...

СЯБРЫНА

«САЛІДАРНАСЦЬ — АДНА З НАШЫХ ГАЛОЎНЫХ МЭТАЎ»

◂ Працяг. Пачатак на стар. 9 (1).

Але мяне ўразіла смеласць беларускіх пісьменнікаў, іх адданая праца і жаданне адстойваць вольнае слова.


— Спадарыня Эва другі раз праводзіць у нас семінары па дзіцячай літаратуры. Безумоўна, беларуская літаратура, у тым ліку і дзіцячая, вельмі мала цяпер перакладаецца, і вельмі цяжка замежніку мець аб'ектыўнае меркаванне пра тое, што мы ствараем, якія ў нас кнігі. Але ж падчас семінараў у вас была магчымасць назіраць за навучэнцамі, слухаць іх ідэі... Як вы ацэньваеце беларускі літаратурны патэнцыял?

Э.С.: — Мне бачыцца, таленавітых творцаў у вас шмат. Але беларускія дзіцячыя пісьменнікі жывуць у значна больш складаных умовах, чым мы, і няма той свабоды, якую я маю ў сваёй прафесійнай дзейнасці ў Швецыі. Уражанне, што апроч усяго іншага, ёсць праблемы і з мэтавай групай — усё менш і менш дзяцей гавораць па-беларуску. Да ўсяго, выконваць задачы стварэння і пошуку мэтавай аудыторыі — гэта вельмі важна для пісьменніка. Калі я прыязджаю сюды, то стараюся паставіць сябе на месца беларускіх пісьменнікаў і аналізую сваё становішча ў Швецыі: які б лёс быў у мяне, калі б ад мяне чакалася так многа? Я лічу, што дзейнасць пісьменніка найперш палягае ў жаданні і магчымасці праз мастацкае слова данесці сваё адчуванне і ўспрыняцце свету, жыцця... Гэта ўжо — шмат. А яшчэ стаяць на барыкадах, мець нейкую грамадскaзначную задачу!..

— Прыемна адзначыць, што супрацоўніцтва са шведскай літаратурнай супольнасцю вылiваецца ў цікавыя, адметныя літаратурныя праекты ў Беларусі. Варта згадаць хаця б тое, што дзякуючы дзіцячай літаратуры: па-беларуску выйшлі шэраг кніг Астрыд Ліндгрэн, Юі Вісландэр, навінка — «Снежны чалавек» спадарыні Эвы. Спадзяемся, і далейшыя стасункі будуць ладзіцца на карысць літаратуры, гэта значыць — на карысць чытача. Шчыра дзякуем вам за супрацу! Кожнае кантактаванне са шведскім бокам дае шмат ідэяў, шмат чаму вучыць...

Г.А.: — Гэта вельмі прыемна. Мы таксама многаму вучымся, тое — ўзаемна.

Э.С.: — Так! Заўжды ты адлюстроўваеш сябе ў іншых людзях…



Эва Суса. Аўтографы на сустрэчы з беларускімі чытачамі

Аўтар выказвае ўдзячнасць Н. Лабада за пераклад падчас гэтай гутаркі

ВЕРШЫ

СМАРАГДАВЫ ШАР

Аляксей АРЦЁМАЎ



Разумны, прыгожы, працаздольны, вельмі сціплы, схільны да перабольшванняў — так ён апісаў сябе сам.

Жыве малады літаратар у Туле, у Беларусі не быў, а вершы піша па-беларуску.

Ляці, валавока!

Я чую, як недзе далёка
Маленькая птушка пяе.
Вітаю цябе, валавока,
Вітаю напевы твае.

Агромністы свет над табою,
Нябёсаў бясконцы абшар
І поўная шчасця й спакою
Адвечнай прыроды душа.

Даўно ў гарадах мітуслівых
Я марыў пра тыя сады,
Дзе грушы ды жоўтыя слівы,
Дзе цёпла й утульна заўжды.

Шукаў іх у град і залеву,
Дарэмна хадзіў па зямлі
І толькі птушыныя спевы
Надзеі згарэць не далі.

Адолею ўсе перашкоды,
Каб радасць нарэшце знайсці.
Да сонца на крылах свабоды
Ляці, валавока, ляці!

* * *

Чаго няма? Маліцца ўсім багам
Не сорамна — я маю ўсё, што трэба,
Хоць мітусні дарэмная вага
Не дазваляе падымацца ў неба.

Што далячынь, калі сярод людзей
Багата слёзаў, і журбы, і стратаў.
А шчасця скарб ляжыць, ды толькі дзе?
Жыццё без змен, як клятва Гіпакрата.

Штодзёншчыны і вэрхала саюз...
Усё далей да прывіднага раю.
Нібы пад спіну палажылі друз,
І скура кожны камень адчувае.

* * *

Пацёртыя вокладкі кніг —
Салдаты ў палку на паліцы.
Забыць бы аб гэтай крыніцы,
Адмовіцца б толькі ад іх!
Пацёртыя вокладкі кніг.

Аддаць іх у краму назад
Ці полымю ў дар, як ахвяру?
Ня здзейсняцца гэткія мары,
І кнігі памілуе кат.
Не здаць іх у краму назад.

Старонкі тамоў не памруць,
Спаліць, загубіць — немагчыма,
Бо вечнасці пільнай пачынак
Няўлоўны, як вадкая ртуць.
Старонкі тамоў не памруць.

І словы мудрэйшых за нас,
І думак іх хітраспляценні
Лунаюць над намі, як цені,
А мы, як раней, увесь час
Баімся мудрэйшых за нас…

* * *

Душа мая — нявольніца:
І хочацца, і колецца
Прайсці па наваколлі ці
Глядзець у хісткі змрок

І слухаць, як пад клёнамі
Трава шапоча сонная
І пасмамі зялёнымі
Змякчае кожны крок.

Шаўковымі кілімамі
Плывуць дарогі-лініі,
Ды толькі змрок адрыне — і
Працягне час свой бег.

Хай застанецца лепшае —
Лісты, цыдулкі, вершыкі,
Сусвет святлом усцешаны.
І шчасце — для цябе.

Камінар

Шпакі галілі крыламі паветра,
Гарэў заход прыгожы, як мана.
На вышыні недасягальных метраў
Хадзіў па дахах чорны камінар.

Блукаў штовечар ён без працы новай
І зразумець не мог, што ўсё дарма.
У джунглях гарадскіх шматпавярховых
Ёсць камінары — комінаў няма.

Жангліраваў кастрычнік жоўклым лісцем
Ды слухаў чалавек, як вецер ныў.
Замест жыцця надзеі засталіся,
Але каму патрэбныя яны?

І доўжыцца дасюль ягоны шпацыр,
І сумна ўніз глядзіць мурзаты твар...
Чаму ж нядаўда пачало здавацца,
Што й я — як гэты чорны камінар?

* * *

Калі ад спякоты сыходзяць у смерць караваны
І сонца падскварвае жвір на вялікай патэльні,
Я бачу раскосыя сківіцы аэрапланаў
Пад імі ляжыць акіян, як агромністы келіх.

Цудоўныя сны, хоць наяве было тут заўсёды
Сухотна і суха, зусім як бывае ў шпіталі.
Няма ні прагрэсу, ні элементарнай свабоды,
Хаця яе людзі, як страву ў кафэ, замаўлялі.

Але ж немагчыма так жыць! Будзьма разам змагацца
І верыць у літасць свяціла і ў моц нашай зброі!
Тады пераможам, і аэрапланы-пасланцы
Нас зноў забяруць у Вялікае Княства спакою...

Смарагдавы шар

Тры тыдні без ветру й залевы...
У яблыні сохне душа
І чутна, як падае з дрэва
Маленькі смарагдавы шар.

І стук той нягучны навокал
Жахлівей за ўсё ды прасцей —
Галіны гатовыя ў спёку
Пазбавіцца ўласных дзяцей.

А жорсткасці гэткай прычына —
Ад тайнаў сусвету ключы,
Ды выпытаць іх немагчыма:
Ты мовіш — а дрэва маўчыць.

І жоўты лісток на галіне
Не скажа, які запавет
Мы людзям наступным пакінем.
Калі нас пазбавіцца свет.

Ліфт

Кабіна ліфта едзе ўніз,
Трасы скрыгочуць у паўзмроку...
Ты пакідаеш парадыз,
Мне да яго яшчэ далёка.

Расстання нашага туга
Не закране цябе, я веру.
Я вінаваты сам — я лгаў,
А ты ўвайшла ў чужыя дзверы.

Што застаецца мне? Глядзець,
Як надвячорак тоне ў скрусе.
Я не чакаю новы дзень —
Дажыць да досвітку імкнуся.

Ды прыйдзе ранак. І тады
Пазбавіць ён мяне спакою:
Кабіна ліфта назаўжды
Зачыніцца перада мною.

*

Дзе тая зорка,
Што асвятляла мой шлях?
Цёмнае неба.

*

У лістах маіх
Ужо няма лішніх слоў.
Адны шматкроп'і.

*

Стары музыка.
Скрыпка пяшчотна пяе,
Хоць дождж за акном.

*

Сняжынкі на шкле.
Быццам мароз студзеня,
Тваё дыханне.

*

Чорны парасон,
Стары брызентавы плашч...
Ці скончыцца дождж?

*

Нябесны блакіт.
Вясною і ў горадзе
Красуе ландыш.

*

Прыступкі царквы.
Бессмяротнасць з невуцтвам
Стаяць тут побач.

* * *

Краіна надзеяў і мрояў!
Чакаю цяпер, каб ізноў
Твае маладыя героі
Паўсталі з сівых курганоў.

Яны павыходзяць з сутоння,
Уздымуць яны вольны сцяг.
Нязгасная зорка Пагоні
Асветліць аціхлы абсяг.

Нарэшце адродзіцца мова,
Каб запанаваць на зямлі...
Пачнецца, я веру, нанова!
Абудзіцца! Толькі калі?

ПАТРЫЯСЛОВЫ

Змітрок КУЗЬМЕНКА

Наведнікам Лініі Сталіна



У ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года ў сутарэннях мінскай унутранай турмы НКУС было расстраляна каля 100 чалавек. Амаль усе — прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі. Сярод расстраляных — 22 пісьменнікі... А крыху раней, жнівеньскім днём, на турэмным двары было спалена некалькі дзясяткаў тысяч канфіскаваных рукапісаў...

Дваццаць два. У адну толькі ноч.
Мо, і сёння жалезныя краты
Помняць рэзка-загадныя «Кроч!»
І халодныя позіркі катаў.

Дваццаць два. У падвал. На расстрэл.
Ад жуды аж мурашкі па скуры.
Раз за разам даносіўся стрэл
У патыліцу літаратуры.

А ў гнятлівым турэмным двары,
Адпаведна з прысудам суворым,
Інквізітары новай пары
Пасылалі на вогнішча творы.

Кажуць, рукапісы не гараць...
Толькі словы прыгожыя гэта.
Бо гараць яны ў зырких кастрах,
Там, дзе кат вынішчае паэтаў.
І ўзнімаліся з дымам шматкі
На вачах ачарсцвелых забойцаў.
Нажывую палілі радкі —
Забівалі пісьменнікаў двойчы.
І ні помнікаў ім, ні крыжоў.
І ніяк не ўцячы ад задухі,
Ад тугі ненапісаных слоў
У прастрэленых кулямі душах.

Апрычнікі

Пэўна ўжо, такі закон прыроды,
Змацаваны тысячамі ран:
Знойдуцца апрычнікі заўсёды,
Як на троне з'явіцца тыран.

Непрыкметна ціхія дагэтуль,
Невукі, дапяўшы да пасад,
Выканаюць з радасцю за гэта
Нават самы жудасны загад.

Будуць шчыраваць і без загаду,
Каб сваю адданасць паказаць.
Выгрызаць прыдуманую здраду,
Іншадумства чыста выматаць.
Будуць услаўляць тырана гучна,
Называць празрыстай каламуць...
А калі настане момант зручны —
Першымі ж тырана прададуць.
І напішуць успаміны потым,
Як нягоднік, кат і цемрашал
Ледзьве не штодзённа іх, гаротных,
Да нядобрых справаў прымушаў...
Так і дажывуць беспакарана,
Ціха скончаць лік гадам сваім.
Знікнуць. Да наступнага тырана,
Каб ізноў з'явіцца разам з ім.

* * *

Скрозь і заўжды беларус вінаваты
Ў тым, што насмеліўся выбіцца з хаты.
Вось і сядзеў на халоднай падлозе
За сваю волю ў расейскім астрозе.
За сваю мову — у польскай вязніцы.
За сваю долю — у злой камяніцы.
За непакору, за погляд бунтоўны —
У фашыстоўскай крывавай катоўні.
Сталінскім лагеры. Карцэры-БУРы.
Энкаведысцкім засценку панурым...
Колькі адседжана тэрмінаў лютых.
Колькі стрывана нялюдскіх пакутаў.
Выцерпеў, быццам, усё да астачы.
Толькі хто мог бы такое прадбачыць,
Што давядзецца сядзець яму хутка
За Беларусь у турме беларускай.

ВІДАРЫСЫ

«СТРАШНА ВЫМАВІЦЬ»

Алесь ПАШКЕВІЧ

***

Праз некалькі месяцаў споўніцца 80 гадоў найстарэйшай творчай арганізацыі Беларусі — Саюзу беларускіх пісьменнікаў…

Дзесяцігоддзямі літаратараў і чытачоў прывучалі да таго, што ідэя аб арганізацыі агульнай пісьменніцкай суполкі прыйшла ў сталінскую галаву: маўляў, з таго часу і аб'ядналіся ў адну сям'ю (ці ў адзін літкалгас) інжынеры чалавечых савецкіх душаў — з памятнага 1933-га (пастановы ЦК кампартыі) ды 1934-га (устаноўчыя з'езды). Так, нібыта, было і з СП БССР, і з СП СССР…

Аднак нават бальшавіцкая цэнзура напачатку «не заўважала» тых фактаў. Напрыклад, у 1927 годзе — калі ў Беларусі станавіліся на крыло пісьменніцкія аб'яднанні «Маладняк» і «Узвышша», выходзіць кніга мемуараў Анатолія Марыенгофа «Роман без вранья», у якой згадвалася пра "дзве пісьменніцкія лаўкі", дзе «таргавалі Асоргін, Барыс Зайцаў, Уладзіслаў Хадасевіч, прафесар Бярдзяеў і яшчэ нехта са старога «саюза пісьменнікаў»». Тое ж сустракаем і ва ўспамінах «Повесть о сестре» згаданага М. Асоргіна: «…наша лаўка, якая была пад крылом Усерасійскага саюза пісьменнікаў і неяк ацалела, абслугоўвала ўсю Маскву і ўсю Расію».

Усерасійскі СП быў створаны ў 1922 годзе на падмурку Дома літаратараў, які восенню 1922-га не атрымаў ад ЧК-ГПУ дазволу на перарэгістрацыю і быў (так-так!) забраны-зачынены. УСП, у які ўваходзілі Ф. Салагуб, Г. Ахматава, А. Блок, М. Гумілёў, Я. Замяцін, К. Чукоўскі і маладзейшыя аўтары з 33-гадовым Л. Ляонавым на чале (усіх членаў — каля 200), праіснаваў да 1932 года — да пачатку агульнай пісьменніцкай «калектывізацыі».

Усерасійскі Саюз пісьменнікаў — «пасаджоны" бацька сваім наступнікам-аб'яднанням, звыклым вуху ў колішняй адной шостай частцы планетнай зямлі. А былі ж яшчэ і «дзяды-прадзеды»… Адзін з першых пісьменніцкіх саюзаў на тэрыторыі былога Савецкага Саюза быў заснаваны ў 1874 годзе ў Маскве і называўся «Таварыства рускіх драматычных пісьменнікаў і оперных кампазітараў» (паказальна, што напачатку ў створаны Саюз савецкіх пісьменнікаў БССР асобнымі «фракцыямі» напачатку ўваходзілі і кампазітары, і тэатральныя дзеячы). Галоўнай мэтай «Таварыства…» стала абарона аўтарскіх правоў.

А ў 90-х гадах таго ж XIX ст. у Расійскай імперыі існаваў «Саюз узаемадапамогі рускіх пісьменнікаў і вучоных». У яго ўваходзілі найбольш значныя літаратары таго часу. Антона Чэхава, да прыкладу, прынялі ў «Саюз…» у 1897 годзе. І Чэхаў называў арганізацыю «Саюз пісьменнікаў» (гл. яго лісты да пісьменніцы Л. Авілавай). Цікава нагадаць і такое прызнанне А. Чэхава: «У з'ездзе пісьменнікаў удзельнічаць я не буду. Восенню буду ў Крыме ці за мяжой, канечне, калі буду жывы і на волі». Гэта — таксама з ліста да Л. Авілавай. А з'езд Саюза ўзаемадапамогі рускіх пісьменнікаў прызначаўся на восень 1899-га — і не адбыўся: не дазволіла Міністэрства ўнутраных спраў!



Фота У. Клімовіча

Тым не менш, дзейнасць згаданага «СП» была актыўнай. Так, 4 сакавіка 1901 года ў Пецярбурзе паліцыя і войскі напалі на бяззбройных грамадзянаў. Былі арышты, высылкі — асабліва моладзі, студэнтаў. І вось 39 членаў Саюза ўзаемадапамогі рускіх пісьменнікаў звярнуліся да міністра ўнутраных спраў расійскай імперыі з рэзкім пратэстам супраць гвалту. Затым з'явіўся «Ліст рускіх пісьменнікаў у рэдакцыі газет і часопісаў», які падпісалі 43 члены згаданага «СП», сярод якіх быў і Максім Горкі. Пасля гэтага і ў асяродку пісьменнікаў царская ўлада правялі арышты. А неўзабаве — 12 сакавіка таго ж года — па распараджэнні пецярбургскага «градоначальника» Саюз узаемадапамогі рускіх пісьменнікаў быў забаронены і ліквідаваны.

«Нам, ніжагародцам, яшчэ ўляцішь за дасланую намі тэлеграму з выказванием спачування Саюзу», — напрыканцы сакавіка 1901 года прызнаваўся ў лісце да Антона Чэхава Максім Горкі — які праз 33 гады ўзначаліць новаствораны сталінскі Саюз савецкіх пісьменнікаў СССР і… зноў адчуе на сабе новы — устакроць мацнейшы — «царскі» ціск.

***

Бліжэйшы прататып Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР — Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў, якая паўстала на тле панішчаных літаратурных аб'яднанняў «Маладняк» і «Узвышша», падчас пагрому нацыянальнай літаратуры ў 1929–1930 гадах, калі ГПУ арыштавала некалькі дзясяткаў беларускіх пісьменнікаў — па сфальсіфікаванай справе Саюза вызвалення Беларусі. Напрыклад, Уладзімір Дубоўка, Язэп Пушча, Нічыпар Чарнушэвіч патрапілі ў «секцыю тэрарыстаў», Адам Бабарэка — у «секцыю моладзі». Тады ж пачалося цкаванне Янкі Купалы і Якуба Коласа ды інспіраваліся іхнія «пакаяльныя» лісты…

У 1929-м — у разгар газетнай кампаніі супраць т.зв. беларускага нацыянал-дэмакратызму — Максім Гарэцкі прапанаваў Янку Купалу і Якубу Коласу выказацца супраць бальшавіцкага пагрому нацыянальнай культуры. Ён нават заклікаў іх у знак пратэсту адмовіцца ад падараванага ім бальшавікамі звання народных паэтаў (Янка Купала атрымаў яго ў 1925-м, Якуб Колас — у 1926-м). Якуб Колас, як згадваў пазней Антон Адамовіч, адмовіўся ад той прапановы. Янка Купала ж згадзіўся, але затым — пад уплывам жонкі — таксама адмовіўся. Пасля гэтага Максім Гарэцкі разарваў з песнярамі былыя дачыненні і дэманстратыўна адаслаў Купалу і Коласу іхнія кнігі з узнёсла-дарчымі аўтографамі…

***

У «Окаянных днях» Іван Бунін (1919 год) прызнаваўся: «Па загадзе самога Архангела Міхаіла ніколі не прыму бальшавіцкага правапісу. Хоць бы ўжо праз тое, што ніколі чалавечая рука не пісала нічога падобнага на тое, што пішацца цяпер гэтым правапісам». Ці не тое ж належыць сказаць і пра беларускую «наркамаўку»? Як — і пра нашае «дзвюхмоўе», асабліва — у галіне культуры. «Пішыце на той мове, з якой нарадзіліся і выраслі. Дзвюх моваў чалавек ведаць не можа. Разумееце: знаць, адчуваць усялякую найменшую драбязу, усялякае адценне… Што можаце вы, напрыклад, падміргнуць чытачу па-французску?». Цытата, зноў жа, з Івана Буніна.

***

Здараецца, што і ў славутых раманістаў-біёграфаў лёсы — раманныя. А ў некаторых — і з «беларускім акцэнтам»…

Найвялікшае каханне Эміля Эрзога, члена Французскай акадэміі, больш вядомага як класіка «раманна-біяграфічнага» жанра Андрэ Маруа, — дзяўчына Жанін Шымкевіч. Ейны бацька — абруселы беларус. Жанін яго, зрэшты, ніколі не бачыла, а чула пра таго ад строгай бабулі і «ветранай» маці. Жылі яны ў Жэневе — «дзіўна» для пурытанскай Швейцарыі…

Андрэ Маруа пазнаёміўся з Жанін Шымкевіч у тэатральным парку О-Віў. Ёй было 17 гадоў. Будучага пісьменніка ўразілі найперш ейныя сінія даверлівыя вочы… Затым быў тэатр, садовая лаўка, размовы, абдымкі…

Андрэ Маруа застаўся ў Жэневе не на два дні, як планаваў, а на тыдзень — і не вярнуўся ў Францыю на бацькаву фабрыку. І развітаўся са сваёй каханкай Сюзанай, якой знімаў у Парыжы невялікую кватэру. Ён наведваў Жэневу кожны тыдзень: днём вёў перамовы з гандлёвымі партнёрамі, а вечары прысвячаў Жанін. Чакаў ейнай паўнагадовасці, накіраваў дзяўчыну вучыцца ў ангельскі каледж, аплочваў рахункі. І кожны дзень атрымліваў ад Жанін лісты.

Нарэшце — пажаніліся. Вайна… Жанін нарадзіла траіх дзяцей і памерла ад сепсіса на пятым месяцы чарговай цяжарнасці. З бацькам засталіся Мішэль і пагодкі Аліўе і Жэральдо. Перад смерцю Жанін спаліла ўсе свае лісты да мужа…

Калі Андрэ Маруа праз два з паловай гады ажаніўся ў другі раз, ён не дазваляў дзецям называць сваю новую жонку мамай…

***

Пасля дзвюх жонак (Яўгеніі Лур'е і Зінаіды Нейгаўз) музай Барыса Пастэрнака стала Вольга Івінская (да сустрэчы з пісьменнікам таксама была двойчы ў шлюбе). Каханне прыпала на новую хвалю бальшавіцкага тэрору. Рассыпаюць падрыхтаваны да друку зборнік «Выбранае» Барыса Пастэрнака. А вечарам 6 кастрычніка 1949 года на кватэру да Вольгі прыйшлі… Арышт, следства. Жанчына — цяжарная, на 5-м месяцы. Праз некалькі месяцаў Пастэрнака таксама выклікаюць на Лубянку. Пісьменнік упэўнены, што яму аддадуць дзіця. Аднак аддаюць… толькі ягоныя кнігі з чуллівымі надпісамі, канфіскаваныя ў Вольгі падчас вобыску. Вольгу ж палохалі, што Пастэрнак таксама арыштаваны. А аднаго разу павялі на сустрэчу з ім… праз мноства падземных калідораў — ва ўнутраны двор Лубянскай турэмнай трупярні. На нарах ляжалі накрытыя дзяругамі нябожчыкі. Вольгу там зачынілі… Шукаць каханага не асмелілася. Страціла прытомнасць. У выніку — выкідыш… Ачуняла ўжо ў турэмнай бальніцы…

***

Сталіна і Гітлера першым з пісьменнікаў «прыраўняў» ці не Альбер Камю (якому ў сёлетнім лістападзе споўнілася б 100 гадоў). «Усе сучасныя рэвалюцыі прывялі адно да ўзмацнення Дзяржавы. 1789 год прывёў за сабой Напалеона… 1917 — Сталіна, хваляванні 20-х гадоў у Італіі — Мусаліні, Веймарская рэспубліка — Гітлера», — пісаў ён.

Напалову маладзейшая за Камю Паліна Дашкава прыйшла — і аргументавана — да глыбейшага: Сталін вучыўся ў Гітлера. «Адольф быў адзіным у свеце чалавекам, якога крымінальнік Сосо паважаў і лічыў роўным сабе, вялікаму»… (гл. раман «Пакт»).

А што пра колішніх дыктатараў напішуць яшчэ праз 50 гадоў!..

***

Цытата з выдадзенай у 1949 годзе «Алеф» Хорхэ Луіса Борхеса: «…я — бог, я — герой, я — філосаф, я — дэман, я — увесь свет, насамрэч жа гэта стамляльны спосаб сказаць, што мяне як такога — няма».

Так і жыццё — ці не нейчая цытата, якую мы прымаем за свой тэкст. Згадваецца беларускі філосаф Валянцін Акудовіч ды яго эсэ-тэза «Мяне няма»…

Зрэшты, яшчэ раней — у 1921-м — Ілля Эрэнбург напісаў раман «Незвычайныя пахаджэнні Хулія Хурэніта і яго вучняў», у якім можна прачытаць: «О, праўду казаў Хурэніта, даказваючы мне, што нічога няма, што няма нават, страшна вымавіць, чалавека!»…

Дык хто ж і што — у астатку — застаецца?

***

Чуючы сённяшні плач аб чытацкай няўвазе ды нараканні аб малых накладах беларускай літаратуры, хочацца працытаваць словы Мікалая Гогаля, моўленыя яшчэ ў 1835 годзе: «Выявілася вельмі яскрава ўсеагульнае раўнадушша да паэзіі». Ці нагадаць наступнае: наклад «Литературной газеты» ў XIX стагоддзі, калі ў ёй супрацоўнічаў Аляксандр Пушкін, быў, як згадваў Мікалай Пагодзін, «едва сто»… А знакаміты ў гісторыі расійскай літаратуры часопіс «Современник» меў у той час каля пяцісот падпісчыкаў; часопіс «Европеец», дзе друкаваліся расійскія літаратурныя аксакалы Жукоўскі, Языкаў, Баратынскі, Пушкін, налічваў іх… пяцьдзясят! І аніхто тады нават не сніў пра электронную кнігу ды інтэрнэт…

Працяг — у наступным нумары.


ПАРАЛЕЛІ

ПАКАРАННЕ БЕЗ ЗЛАЧЫНСТВА

БЕЛАРУСКАЯ ТУРЭМНАЯ ПАЭЗІЯ

Арнольд МАКМІЛІН

У Беларусі цягам XX і XXI стагоддзяў многія людзі былі пакараныя пазбаўленнем волі за «злачынствы», якое палягала ў супраціўленні палітычным сістэмам або абароне свабоды нацыянальнай і рэлігійнай меншасці. Так было за царамі, калі Беларусь называлі Паўночна-Заходнім краем Расійскай імперыі; паміж 1921 і 1939 гадамі, калі Заходняя Беларусь была пад уладай Польшчы; да і пасля Другой сусветнай вайны ў Савецкай Беларусі і, вядома, падчас апошніх васямнаццаці гадоў аўтарытарнага кіравання.



У гэтым артыкуле разглядаецца паэзія тых, хто зазнаў турэмнае зняволенне, а не раптоўнае знішчэнне, напісаная (ці ў некаторых выпадках вывучаная напамяць для пазнейшага запісу) у турме (тут да яе прыраўнаны і ГУЛАГ). Стаўленне вязняў да палону вагаецца ад непадпарадкавання да адчаю, у іх творах ёсць мноства параўнанняў з навакольным светам і апраўданая трывога за тое, што там адбываецца. А найперш — воля выжыць, не ў апошнюю чаргу з дапамогай занатоўвання свайго досведу ў літаратурнай форме. Сярод гэтых вязняў — самыя розныя людзі: ад Якуба Коласа, аднаго з народных паэтаў Беларусі, да некаторых творцаў, чыя літаратурная слава грунтуецца ў асноўным на вершах, якія яны напісалі пра турму.

Сярод самых распаўсюджаных тэмаў, што нядзіўна, нараканні на суровы лёс і фізічную брутальнасць, абураны пратэст, выклік і адроджанае пачуццё патрыятызму. Галоўны падзел пралягае паміж беларускай літаратурай, напісанай у турмах цяперашняга рэжыму, і напісанай у польскіх, літоўскіх ды беларускіх турмах, а таксама ў савецкім ГУЛАГу.

Два вельмі розныя вязні красамоўна напісалі пра свой досвед у часе станаўлення сучаснай беларускай літаратуры. Якуб Колас супраціўляўся царскай уладзе і быў неўзабаве зняволены ў цэнтральным астрозе Мінска, а яго малодшы сучаснік Алесь Гарун зрабіў палітычную «памылку», пайшоўшы за генералам Пілсудскім, — і цягам многіх дзесяцігоддзяў яго імя нельга было згадваць у Савецкім Саюзе ў сувязі з ягонай апазіцыяй бальшавікам. Алесь Гарун быў сасланы ў Сібір яшчэ ў часе Расійскай імперыі — пасля зняволення ў Менску і Вільні.

У вершы «Ноч у астрозе» (1908) Якуб Колас дакладна адлюстроўвае знаходзіцца ў маркотным і разгневаным стане, калі параўноўвае знаходжанне ў турме з цеснатой труны ці магілы, але побач з тым робіць больш арыгінальную літаратурную заўвагу, параўноўваючы турэмны калідор з разяўленай пашчай змяі; ён таксама апісвае некаторыя змрочныя фізічныя дэталі, як, напрыклад, звон парашы...

Паэзія Алеся Гаруна значна больш эмацыйная, бо ён згадвае ўсё страчанае і наракае не толькі на свой лёс, але і на тое, што лічыць пакараннем усёй Беларусі; ён нават просіць сваю каханую не пісаць яму, бо яе лісты нагадваюць яму пра шчаслівае мінулае (аб чым мы чытаем у вершы «Ёй»):

Хачу прасіць... Найлюбшая,
святая!
Пакінь пісаць ты мне...
Забудзься... Не пішы!..
Каб знала ты, як мыслі
аб няволі
Пасля тваіх лістоў яшчэ цяжэй
гнятуць...

Алесь Гарун, вялікі паэт, які доўгі час не публікаваўся савецкай уладай, піша пра сваё жыццё ў расійскіх турмах, спалучаючы яркія дэталі і красамоўны лірызм.

Язэп Германовіч (1890–1978), які стварыў пад псеўданімам Вінцук Адважны, у 1962 годзе напісаў справаздачу аб сваіх падарожжах «Кітай, Сібір, Масква», а праз два гады выдаў твор, які назваў сучаснай казкай у вершах, — «Князь і лапаць». На пачатку аднаго з раздзелаў апошняй, названага «Сібір», ён падкрэслівае вялікую разнастайнасць выгнаных народаў (А. Салжаніцын зрабіў тое самае шляхам увядзення сімвалічных персанажаў у свой расповед пра адзін дзень Івана Дзянісавіча).

Вінцук Адважны — не толькі смелы, але і высокадухоўны чалавек, які ў далейшыя гады быў святаром у грэка-каталіцкай парафіі ў лонданскім Фінчлі. Яго вершы простыя, напісаныя ў рыфмаваных куплетах, вельмі апісальных, але забаўляльных, хоць іаднастайных з пункту гледжання вершаскладання.

Сяргей Новік-Пяюн (1906–1994) быў спярша зняволены палякамі, пасля немецкімі захопнікамі, пакуль, урэшце, не быў накіраваны Сталіным у савецкія лагеры. Ён правёў каля паловы свайго жыцця ў няволі. Не меў пісьмовых прыладаў і быў вымушаны запамінаць свае вершы, каб рэканструяваць іх пазней у зборніку «Песні з-за кратаў», упершыню апублікаваным у год яго смерці. Шчаслівыя згадкі пра Беларусь і ўспаміны пра каханую, расстраляную немцамі, спалучаюцца ў ягоных творах з меланхоліяй і адчуваннем слабасці ды фізічнага заняпаду. У вершы «З крыві беларускай», напісаным у 1945 годзе ў Якуціі, ён сцвярджае, што Беларусь заваявала свабоду і застанецца свабоднай назаўсёды. Вось апошнія дзве страфы:

Няволя моц духу нічуць не зламіла,
Надзеі і веры агонь не пагас.
Пазнае йшчэ вораг крывіцкую сілу,
Як прыйдзе расплаты апошняе
час.

Наперад ісці незалежніцкім
шляхам
Наказваем дзецям і ўнукам сваім
Пад бел-чырвон-белым крыўскім
мы сцягам,
Пад знакам крывіцкай Пагоні
святым.

Некаторыя з палымяных патрыятычных вершаў Сяргея Новіка-Пеюна, у тым ліку гэты, з мноствам згадванняў беларускіх сцягоў ды іншых сімвалаў, пазней сталі вельмі папулярнымі песнямі — хоць і не карысталіся папулярнасцю ў савецкай ці, фактычна, постсавецкай улады.

Ларыса Геніюш (1910–1983), беларуская паэтка, якая пісала вершы і ў Сібіры, была, без сумневу, найбуйнейшай літаратурнай постаццю. Яе жыццё і лёс, як вядома, надзвычай цяжкія. Вярнуўшыся пасля уцякацтва ў часе Першай сусветнай вайны з Расіі на радзіму ў 1919 годзе, яна рушыла ўслед за мужам у Прагу ў 1937-м, адкуль была выкрадзеная супрацоўнікамі НКВД у 1948 годзе ды сасланая ў Сібір. Напісаны на пачатку 1950-х гадоў верш «Крывёй напоўніліся поймы рэк...» дае яркую карціну калоны зняволеных жанчын, у якой паэтка адчувае сябе як дзёрзкая ваўчыца, поўная пачуццяў да Беларусі, падкрэсленых выклічнікамі, хоць «ланцуг накінулі на шыю салаўю». Вось першыя дзве страфы:

Крывёй напоўніліся поймы рэк,
Бурліць адчаем слёз людскіх
разводдзе.
Гляджу на свет. Я — лагернік,
я — зэк,
Засуджаны на мукаў чвэрць
стагоддзя.

Мяне драты, сабакі сцерагуць,
Дзікіх надзораў зграя нада мною,
І лоб штодня мой на прыцэл
бяруць
Навучаныя забіваць канвоі.

Ларыса Геніюш выяўляе не менш сілы духу, чым мужчыны — перад абліччам жудасных умоваў. Многія яе вершы пра суровасць існавання ў Сібіры паказваюць яе чалавечнасць у дачыненні да іншых і бясконцую асабістую мужнасць — якасці, якія засталіся з ёй, калі ў 1956 годзе паэтэсе было дазволена вярнуцца ў Беларусь, хоць і не рэабілітаванай.

Многія нацыянальна свядомыя беларусы ў Заходняй Беларусі былі зняволены польскай дзяржавай, і чацвёра з іх падзяліліся сваімі ўражаннямі ў літаратурнай форме. Найбольш значным паэтам быў Максім Танк (1912–1995), які заклікаў да супраціву ў даволі напорыстым вершы «Не забывай» (1934), прапаноўваў (літаральна) перапіліць і разарваць сталёвыя ланцугі ды сцены з калючым дротам. Верш гэты ўпэўнена гаворыць пра будучую перамогу.

Валянцін Таўлай (1914–1947) — паэт, які планаваў перапіліць паэзіяй краты сваёй турмы. Ён быў зняволены ў вязніцы за творы, якія, як ён распавядае ў вершы «Аб маіх вершах» (1941), шпегі параўналі з дынамітам.

У вершы «Апошняе слова» (1929) Валянцін Таўлай таксама спадзяецца, што ягоныя вершы будуць чытаць на барыкадах супраціўлення. Нарэшце, у журботным вершы «Мінуў астрожны дзень», напісаным таксама ў 1929 годзе ў сумна вядомай Лукішскай турме ў Вільні, ён кажа, што ягоныя нягоды кідаюць цень на далікатную форму ягоных вершаў, калі заканчваецца яшчэ адзін дзень жыцця ў турме:

Жалоба цень кладзе
на верша тонкі стан:
яшчэ адзін мой дзень
сканаў, як арыштант.

Міхась Машара (1902–1976), яшчэ адзін палітвязень Лукішкаў, у простым вершы «Гэй, браточкі, з мур-званіцы...» (1927) таксама заклікае буру знішчыць ягоную вязніцу, а зняволеныя прытым мусяць дапамагчы ёй, гучна грукаючы па сценах, быццам званочы ў званы і спяваючы песні пра свабоду, падобныя да навальніцы.

Чацвёртым з паэтаў, зняволеных палякамі, быў Хведар Ільяшэвіч (1910–1948). Ён пражыў амаль гэтаксама мала, як і Таўлай; ягоныя вершы былі сабраныя пасмяротна. Ён шмат часу правёў на Лукішках, але пакінуў параўнальна няшмат вершаў пра турму. Ён распавядаў пра ноч як асабліва цяжкі час, марыў пра родную вёску і лугі... Паэт апісвае маладыя кветкі, што вянуць у турме праз адсутнасць сонца, святла і расы, параўноўвае іх з сабой...

Астатнія паэты — належаць да эпохі Лукашэнкі. Славамір Адамовіч (нар. у 1962), які рэзка выступае супраць рэжыму, напісаўшы верш на расійскай мове «Убей президента!». У турме ён апісаў галадоўку, падчас якой нібыта пабачыў у галюцынацыі Воланда з рамана «Майстар і Маргарыта» Міхаіла Булгакава: «Вітальныя галюцынацыі на выхадзе з галадоўкі». Турэмны дзённік С. Адамовіча, як і кніга У. Някляева «Лісты да Волі», змяшчае элементы гумару, у прыватнасці, у вершы «Не гані пургу, начальнік...».

Уладзімір Някляеў (нар. у 1946) — складаны і амбітны паэт, які заслужыў прызнанне, сярод іншага, за багатае ўяўленне і адметныя вобразы сваёй паэзіі. Ён таксама вядомы як кандыдат у прэзідэнты Беларусі на выбарах у снежні 2010 года, калі ён быў жорстка збіты, выкрадзены са шпіталя і кінуты ў турму КДБ на праспекце Незалежнасці.

Найбольшым унёскам У. Някляева ў тэму турмы стала кніга вершаў, якія ён напісаў жонцы ў часе свайго тэрміну пазбаўлення волі, «Лісты да Волі» (2011). Гэта — шэдэўр, які часам нагадвае вельмі багатыя на ўяўленчыя знаходкі апавядальныя паэмы. С. Адамовіч у турме разважае пра сэкс і каханне даволі празаічна, а вобразы, створаныя У. Някляевым у «Лістах да Волі», вызначаюцца незвычайнай складанасцю.

У кнізе ёсць шмат выпадкаў гульні з імем яго жонкі і словам «воля» ў значэнні «свабода». Сапраўды, галоўная тэма ў гэтай кнізе, — воля і яе сувязь з паэтавай жонкай. Паэт марыць пра сэкс і тое, як Воля народзіць сваё імя, г. зн. свабоду, але прачынаецца, каб знайсці сябе ў абдымках турмы, якая, як ні дзіўна, пытаецца, ці яна мусіць апладніць ягоную жонку ў клетцы...

Свабода і Бог дамінуюць у фінале гэтага цыкла вершаў. Свабода — гэта не тое, што трэба любіць, а тое, што неабходна, як вада ў смагу. Турма і свабода нішто ў параўнанні з Богам, кажа паэт, а кроў, пралітая за свабоду, больш каштоўная за любую іншую. Просячы ў Бога прабачэння, паэт робіць відавочна аптымістычную выснову аб тым, што свабода выжывае нават у турме. Ён таксама ярка апісвае гукі няшчасця і пакутаў у фізічнай турме, заканчваючы старажытным праклёнам, які атачае беларусаў:

І з дальніх лёхаў даляцеў
Задушны стогн, жалобны спеў
Усіх
загнаных у скляпенні,
Тых,
хто пракляты ў пакаленнях
Праклёнам даўніны сівой:
«Бадай бы вам цягаць камені
На дом чужы, а не на свой!»

У гэтай сувязі можна адзначыць, што на пачатку сваёй кар'еры У. Някляеў атрымаў вельмі пачэсную прапанову выдаць кнігу расійскамоўных вершаў у Маскве, але адмовіўся ад ідэі цягаць каменне на чужую хату і, несумненна на шчасце, выпрацаваў пісаць толькі на беларускай мове...

Няшчасны лёс Беларусі прывёў да стварэння значнай колькасці літаратурных тэкстаў, створаных у турме і пра турму. З чыста літаратурнага пункту гледжання, фантастычная сіла ўяўлення Уладзіміра Някляева прывяла да стварэння самых выбітных з літаратурнага гледзішча твораў, у той час як вершы Ларысы Геніюш пацвярджаюць мужнасць і пакуты жанчыны ў турме. Іншыя паэты перадаюць рэальнасць турмы мінулага больш, чым тое зроблена ў творах, напісаных пры цяперашнім рэжыме. Пакаранне ўсіх паэтаў, згаданых тут, несумненна, жахлівае злачынства, але літаратурныя яго «наступствы» заўсёды цікавыя, а ў некаторых выпадках маюць сапраўдную культурную каштоўнасць.


Друкуецца ў скароце

ДРУК

«ПРАНІКНІСЯ АДКАЗНАСЦЮ ЗА ЧАС»: «ДЗЕЯСЛОЎ, № 66»

ЛеГАЛ

Ну вось неўпрыкмет і насунулася пахмурная пара восеньскай слоты і халоднага роздуму над жыццём. Як па мінулым маім часе, дык гэта якраз і была пара зануранага вечаровага кніжнага чытання. Але дзе той час і дзе тыя кнігі?



Зрэшты, нават тады, на самым пачатку 80-х, далёка гледзячы з вышыні электрычнага слупа, я пісаў: *«так мала чытачоў, і тыя ўсе — паэты»*… Як у ваду глядзеў. Ды і не адзін я тое ведаў. Але бальшавікі неяк ідэалагічна адцэньвалі гэтую ўвагу іншым, умела скрашваючы і прыхарошваючы жыццё і быт сваіх пісьменнікаў.

Сёння ж нават існаванне прыўладных летапісцаў, можна сказаць, аніяк не заўважаецца іх ідэйным бацькам. Ні табе дармавой кніжкі, ні мусова да яе прыстаўленых чытачоў. Адным словам, жыві напісаным…

То хто чым можа, тым і жыве. Надоечы зацікавіўся праграмай канала «Беларусь-3» (культура). Заўважыў ранішнюю перадачу «Дыя@блог» (пра літаратуру). Думаю, дай зірну, пабачу-паслухаю, раптам што цікавае скажуць. Уключыў, а там маладая расійскамоўная вядучая абмяркоўвае з літаратаркамі Таццянай Сівец і Вольгай Тарасевіч праблему беларускамоўнай і расійскамоўнай літаратуры і рэалізацыю кніжак. Ну, я вам скажу, таго, што я пачуў ад Тарасевіч, мне хапіла, каб адразу ж выключыць тэлевізар… Яна натуральна і сур'ёзна параўноўвала рэалізацыю пяльменяў і кніжак (упакоўкі і вокладкі)! Сівец, хоць і скрывілася, і ўставіла сваё *«ну, як можна параўноўваць духоўнае і матэрыяльнае»*, але ўсё адно ў атачэнні прарасійскіх жанчын глядзелася сіратліва і безабаронна. Ёсць, на жаль, у нас і такая вось культура...

«Дзеяслоў» яшчэ чытаюць. Не толькі яго аўтары. І, трэба сказаць, ёсць што. І хоць гэты нумар візуальна праекце д'ябальскую сімволіку (66), насамрэч яго мастацкі пасыл ідэйна гуманістычны.

Зрэшты, запеўка **(апавяданне Уладзіміра Някляева «Барыбэры»)** нечым гэткім містычна-вядзьмарскім усё ж аддае (булгакаўшчынай, у добрым сэнсе). Жыццёвая, лёгка-артыстычная фантасмагорыя беларускай гісторыі, замяшаная на трох апошніх стагоддзях яе існавання, з вельмі яркімі і пазнавальнымі вобразамі, літаратурна-культуралагічнымі экскурсамі і адсыламі. Славянскія бясконцыя разборкі ў пошуках ісціны і свайго самасцвярджэння, найперш у шэрагах культурнай эліты, вельмі дасціпна і трапна накладваюцца на нашу сучасную грамадска-палітычную і культурную сітуацыю. Твор таленавіты. (Адзінае, як на мой густ, у аўтара ёсць некаторы перабор з іранічнасцю стылю.) Чамусьці запомнілася сказанае ў фінале апавядання жонкай галоўнаму герою, разгубленаму ад усяго ім містычна перажытага: *«Вось і ўсё вашае жыццё. Занясі ў падвал, куды яно тут…»* Уласна я думаю, што сюжэт апавядання (з новымі калізіямі ў духу цяперашняй нацыянальнай драмы) можна было б развіць і развінуць да памераў кампактнага еўрапейскага рамана.

Дарэчы, што да рамана, то працяг аднаго з іх **(Эрнэст Ялугін, «Перад Патопам»)** друкуецца ў гэтым нумары. Твор, як для такога аб'ёмнага тэкста, занадта камерны, стылёва запаволены і сюжэтна маланапружаны. Але, як чалавек, які прачытвае кожны часопіс ад першай да апошняй старонкі цягам трох гадоў, маю сказаць, што гэты гістарычны твор усё ж варты шырокай увагі. Раман вызначаецца вельмі дасканалым веданнем прадмета пісання, адмысловым досведам тагачаснага вяльможнага і просталюднага жыцця, прыроды, традыцый, звычак, навыкаў (вядзьмарства, лекарства, бортніцва, кухарства, палявання)… Ды і мова аўтарская на высокім узроўні. Каталіцтва, праваслаўе, пратэстанцтва, палітыка ВКЛ (Жыгімонт Аўгуст) і Маскоўскага царства (Іван Грозны), перыяды замірэння і падпісання Люблінскай уніі, вобразы Буднага, Цяпінскага, Радзівілаў паказаны праз жыццё вярхоў і нізоў. Агулам, у рамане адчуваецца дух таго часу і эпохі… Уражліва выпісаны і сімвал нацыі — галоўны герой твора бортнік з-пад Мсціслаўля Зых ці, як напісана ў выдадзенай яму «вольнай» Жыгімонтам Аўгустам: Захар Гудавіч (моцны целам і духам).

Дакументальна-дзённікавы **расповед Сяргея Рублеўскага «Кіно прыехала!»** пра жыццёбыццё вясковай малечы напрыканцы 50-х… Настальгія, якая засцягвае чытача ў свой нерат, тым больш, што і «рыбак» адмысловы. Хоць некаторыя падшыванцы стараліся прашмыгнуць «міма касы» і глядзець кіно, лежачы на пыльнай падлозе. Аднак, як піша аўтар, *«пыл той, здаецца, не атрос і па сёння. Ды і не імкнуся: у ім жа — мая светлая памяць»*.

Што тычыцца **апавядання Евы Вежнавец «Вінны яблык»**, то магу сказаць, маючы даволі значны алкагольны вопыт (дзякаваць Богу, ужо даўні), што хоць сюжэтна твор падаецца павярхоўным, але псіхалагічна ён усё ж выспелы… Чытаецца. Можна, мабыць, для глыбейшага задавальнення засесці за яго і з бутэлечкай добрага піва… А*«калі вам брыдка — абмініце, як абмінула я Анатольеўну. Гэта не вашая рэальнасць і не вашая віна»*, — зазначае пісьменніца.

Чытэльныя, поўныя іроніі і сарказма да рэалій нашага і савецкага часу **аповеды Уладзіслава Ахроменкі «Музы і свінні»**.

З двух **аповедаў** нядаўняга юбіляра (віншуем!) **Генадзя Дзмітрыева** адзін, пад назвай «Рэінкарнацыя», мае права на чытацкае жыццё. У ім ярка вымалёўваецца беларуская ментальнасць і гіблы аграрна-постсавецкі характар герояў.

Апавяданне Касі Дземянчук «Гарбата з мёдам і меліссай» падобнае пакуль на практыкаванне ў лірычнай прозе. Тэкст з нацяжкай можна было б назваць і свабодным вершам, але нават пры такім раскладзе яўна не хапае пэўнасці сюжэтных акцэнтаў…

Друкуюцца аднатыпна-шматслоўныя **зацемкі Наталлі Навіцкай «Гадавое прызнанне»**. На мой погляд, ім бракуе глыбокага і па-мастацку вобразнага аналізу жыцця.

Паэзія і вершы — гэта як неба і зямля. Паміж імі ў *авіянізцы* «Аблокі» і лунае ў сваіх іранічных відзежах **Вера Бурлак**.

Следам друкуюцца чыста зямныя **вершы** двух братоў-блізнюкоў **Анатоля і Васіля Дэбішаў** з Берасця. У Анатоля пераважаюць матывы пошукаў душэўнай раўнавагі ў аднастайнасці буднічнага жыцця. Хоць прабіваецца і прага да эзатэрычнага:

«Час вымольваць сны паэту».

Васіль жа яму пярэчыць на ўзроўні метафарычнай падсвядомасці:

Звінеў у небе жаўраначак божы,
І радасна трымцелі матылькі…
Ішоў за плугам я. За мной прыгожа
Раўнюткія ўзыходзілі радкі.

Вядомы мастак і мастацтвазнаўца **Фёдар Ястраб** пачаў практыкаваць у паэзіі толькі два гады таму. І ўжо, як пазначана ў біяграфічнай даведцы, падрыхтаваў да друку шэсць кніг санэтаў. Выдрукаваная нізка «Вечны Пілігрым» лірычна-грамадзянскага ўхілу, схопленая відарысам сённяшняга часу. Не ўсё роўна важкае, але найбольш удалае змушае запыніцца на асобных радках і раздумацца над сэнсам чалавечага жыцця. Здзівіла, што Бог чамусьці пішацца з малой літары, а, скажам, Абсалют, Нарцыс, Зло — з вялікай… Зрэшты, гэта неад'емнае права аўтара. Галоўнае, высокі вобразны пасыл самой паэзіі (назва агляду часопіса мною запазычана адсюль):

О, як хацеў бы высвеціць тыран
Сваю асобу ў бляску, без заган,
І рыскі каб ніводнай выпадковай!
А ты, хто піша пра сябе і нас,
Пранікніся адказнасцю за Час —
Не прадавай душу, а з ёй і — слова!

Метафарычна лёгкаўздымныя, рухавыя і ілюзорныя **вершы Іны Снарскай** (былой палачанкі, а цяпер палтаўчанкі). Нейкая хісткасць, няпэўнасць і няўлоўнае імгненнае самазгаранне (ці яшчэ не ў працэсе стварэння), як мне падаецца, ёсць іх фатумам. Уласна мяне яны захапляльна ўскалыхнулі і, раптам, гэтак жа пакінулі недаўменным… Вельмі дакладна гэтае адчуванне занатавала сама паэтка:

Калі б на дрэвах не было кары,
калі б душой мы ўмелі гаварыць…

Як ні дзіўна, пабытова-праставатыя, на першы погляд, **вершы Ірыны Бельскай** з нізкі «Мы дзеці аднаго Бога» мне спадабаліся дарэшты не раскрытай глыбінёй і празрыстай бязважкасцю дысгарманічнай няўлоўнасці… лёсам, у рэшце рэшт. І ўвогуле:

Хіба можна пісаць вершы,
Калі нават не ўмееш фармуляваць
Просьбы да Бога?..

Магчыма, гэта найлепшае з паэтычных публікацый гэтага нумара.

Неардынарны (свой!) стыль пісьма і вершатварэння ў **Асі Волкавай**, якая выступае з паэтычнай нізкай «Тэт-а-тэт». Досыць паветра і прасторы між слоў і радкоў для глыбокага дыхання напоўніцу і разгадкі таемна-прыхаваных намёкаў і адсылаў. Адным словам, займеў эстэтычнае задавальненне ад прачытання.

Вершы Мікіты Прыходзькі — з душой, але без стала выпрацаванага стылю і сякімі-такімі агрэхамі ў вершасkладанні. І ўсё ж хочацца, каб аўтар сваёй паэтычнай «не згубіў дарогі», як ён пра тое заяўляе.

Вершаваны дэбют сямнаццацігадовай **Ксені Бандарэнка** пакуль яшчэ вучнёўскі з усімі пачаткоўскімі спатыканнямі, хоць сям-там паэтычны голас праразваецца, дух бунтуе і слова пачынае вымыкаць з астрожнага душэўнага палону…

Вершы навырост і яшчэ ў аднаго дэбютанта **Максіма Шняка.** Ёсць унутраная лёгкасць і гатовасць да палёту, але няма стылістычнай напоўненасці вышукаваным і вынашаным словам. І ўсё ж надзея на творчую саспеласць адчувальная.

Яшчэ з мастацкіх публікацый адзначым пераклады з англійскай **паэзіі Льюіса Кэрала**, зробленыя *Максам Шчурам.* **Вершы** паляка **Тадэвуша Міціньскага** перастварыла *Ірына Хадарэнка.* (Агулам часопіс цяпер друкуе шмат перакладаў з розных моў свету. Прычым пераважна перакладаў дабротных і адмысловых. Гэта пашырае далягляд як саміх чытачоў, так і ўздымае цэнз самой беларускай літаратуры ў вачах замежнай культурнай эліты.)

Афарызмы і выслоўі Алеся Гібок-Гібкоўскага сведчаць пра яго неардынарны вопыт і аналіз уласнага жыцця. Гэта, калі пры набліжэнні, далягляд не аддаляецца, а сціnaецца да крытычнай масы свайго сутнасnага выяўлення…

Успаміны з «Сіняй кнігі беларускага алкаголіка II» Антона Кулона неяк асабліва не ўзрушылі. Ведаючы згаданую праблему знутры, уласна мне не хапіла цвярозасці і глыбіні роздуму, нераўнуючы як п'янтосу прахалодна-кіслага расолу на апахмелку.

З глыбокай удзячнасцю да аўтара прачытаў шчыра-душэўныя **ўспаміны Валяр'яна Кісліка** пра яго вядомага брата Навума Кісліка, рускамоўнага беларускага паэта і перакладчыка, яго нялёгкае будзённае жыццё, радасці творчасці, сяброўства і адзіноту са словам…

Асэнсаванне грамадска-палітычнага і грамадзянскага стаўлення людзей і канкрэтнага чалавека да нацыянальных ідэалаў у перыяд цяжкіх гістарычных выпрабаванняў — у артыкуле заложніка сучаснага рэжыму знанага праваабаронцы **Алеся Бяляцкага,** напісанага з нагоды 25-годдзя першага масавага мітынгу на «Дзяды» ў Беларусі. Ярка паказаны людзі, факты, учынкі і дзеі падчас змагання перадавой часткі беларускага грамадства за нацыянальную незалежнасць, чалавечы гонар і годнасць. Такім словам нельга не верыць: *«Двойчы ў жыцці мяне ахоплівала такое адчуванне, калі да пэўнага моманту цябе трымаюць у абдымках розныя турботы, калі ты разумееш, што ёсць яшчэ час адступіць, але ўсё роўна ідзеш наперад у спадзяванні, што ўсе клопаты неяк рассеюцца самі па сабе. А потым надыходзіць такі момант, калі гэтыя клопаты нечакана разрастаюцца і паўстаюць перад табой сцяною, каменным мурам. І ты адкідаеш усе сумненні, табе робіцца абыякава, абыдзецца яно ці не. Тваё "я" становіцца паслухмянай прыладаю невядомай волі, якая спала ў табе і прачнулася, якая сталёвай рукой кіруе тваімі ўчынкамі. Першы раз я спазнаў гэтае пачуццё за некалькі дзён перад «Дзядамі» ў 1988 годзе, а другі раз — перад маім арыштам у жніўні 2011 года»*.

З нагоды юбілею Сцяпана Някрашэвіча друкуецца **артыкул Дзмітрыя Паўлаўца. Ігар Набытовіч** з Украіны піша пра творчасць Сяргея Кавалёва, **Анатоль Сідарэвіч** — пра вядомае і невядомае ў літаратуразнаўчых і крытычных працах Рыгора Семашкевіча.

З крытычнымі матэрыяламі і рэцэнзіямі выступаюць: **Ала Петрушкевіч** — пра паэта Едруся Мазько, **Алеся Лапіцкая** — пра раман «Сімъ побѣдиши» Алеся Пашкевіча, **Алена Ніякоўская** — пра раман «Палімпсэст» Алеся Аркуша, **Леанід Галубовіч** — пра зборнік вершаў «Кроплі дажджу» Міколы Кандратава.

Завяршае публікацыі нумара кніжная анатацыйная рубрыка «Дзеяпіс».

Выпісвайце, купляйце і чытайце часопіс «Дзеяслоў»! Назапашвайцеся нацыянальным духам. Ён неўзабаве ой як спатрэбіцца…

ЛІТКАЛЕЙДАСКОП

ДАНТЭ І НАРКАЛЕПСІЯ

Няўролаг з Балонскага ўніверсітэта Джузэпэ Плацці апублікаваў у аўтарытэтным медыцынскім часопісе «Sleep Medicine» вынікі свайго даследавання, падчас якога ён прыйшоў да высновы, што Дантэ Аліг'еры (1265 –1321) мог пакутаваць наркалепсіяй.

Гэта захворванне нярвовай сістэмы, якое суправаджаецца прыступамі дрымоты і раптоўнага засынання. Навуковец адзначыў у галоўным творы вялікага італьянца, «Боскай камедыі», шэраг эпізодаў, якія адлюстроўваюць сімптомы наркалепсіі, а таксама нярэдка і катаплексіі (раптоўнай страты тонусу цягліцаў). Дзіўная дакладнасць апісання гэтых станаў прывяла Плацці да высновы, што яны з'яўляюцца адлюстраваннем хваробы аўтара, а не проста мастацкім прыёмам.


Раптоўныя пераходы ад няспання да сну, хуткаплынны і падбадзёрлівы сон, відзежы і галюцынацыі, раптоўная слабасць, — паэт Дантэ абсалютна дакладна апісаў уласцівыя наркалепсіі сімптомы за 600 гадоў да таго, як навукоўцы адкрылі гэтую з'яву.

Дарэчы, падрабязных звестак пра біяграфію і фізічныя асаблівасці бацькі італьянскай літаратурнай мовы не захавалася, таму асноўнай крыніцай біяграфічнай інфармацыі для некаторых даследнікаў і служыць яго творчасць. І няўролаг Плацці — не першы ў тым шэрагу. Так, у XIX стагоддзі псіхіятр і крыміналіст Чэзарэ Ламброза сцвярджаў, што Дантэ пакутаваў эпілепсіяй, аднак Плацці катэгарычна аспрэчвае яго версію.

УШАНАВАННЕ

ШЫЛЬДА ВАРЛАМУ ШАЛАМАВУ


У Дзень памяці ахвяр палітычных рэпрэсій у Маскве адбылося адкрыццё мемарыяльнай шыльды аўтару «Калымскіх апаведаў» Варламу Шаламаву.



Гэта стала магчымым дзякуючы высілкам супрацоўнікаў Музея гісторыі Гулага, Міжнароднага таварыства «Мемарыял», рэдакцыі сайта Shalamov.ru, «Новой газеты», Саюза пісьменнікаў Масквы і Рускага ПЭН-цэнтра.

Шыльду ўсталявалі ў Чыстым завулку, на доме №8, дзе В. Шаламаў жыў з 1934 па 1937 гады — паміж двума тэрмінамі, якія ён адбываў на Калыме. Аўтар працы — скульптар Георгій Франгулян, народны мастак Расіі.

В. Шаламаў вядомы як аўтар твораў пра побыт ахвяраў сталінскіх рэпрэсій у лагерах Сібіры і Далёкага Усходу. Першы раз ён быў арыштаваны ў 1929 годзе за ўдзел у падпольнай трацкісцкай групе і за распаўсюд дадатку да «Заповетов Ленина». Толькі ў 1956 годзе пасля рэабілітацыі ён змог легальна вярнуцца ў Маскву.



СКУЛЬПТУРА БЭЛЫ АХМАДУЛІНАЙ

У Тарусе (горад у Калужскай вобласці Расіі) адкрыты помнік паэтцы Бэле Ахмадулінай.

Яго аўтар — мастак і скульптар Барыс Месэрэр, муж паэткі. Скульптура стаіць на высокім беразе Акі.

Біяграфія Б. Ахмадулінай цесна спалучана з Тарусай. Яна называла гэты горад «сваёй музай», яе натхнялі неверагодная прыгажосці пейзажы і простыя людзі. Па словах паэткі, менавіта тут яна зразумела, што шчасце ёсць.

У горадзе на Ацэ Ахмадуліна напісала ідылічны «Тарускі цыкл» і «101-ы кіламетр».

У планах ужо з наступнага года праводзіць у Тарусе літаратурна-музычны фестывалі ў памяць пра Б. Ахмадуліну.

«КАНОН ШЭКСПІРА»

Тры тыдні таму ў Вялікабрытаніі выйшла кніга «William Shakespeare and Others: Collaborative Plays» («Уільям Шэкспір і іншыя: п'есы, напісаныя ў суаўтарстве»), прысвечаная творчасці вялікага брытанскага драматурга.

Джонатан Бейт, прафесар англійскай літаратуры Оксфардскага ўніверсітэта, пасля правядзення комплексных даследаванняў ініцыяваў уключэнне ў выданне дзвюх п'ес, якія раней афіцыйна лічыліся ананімнымі.

Па словах Бейта, асобныя сцэны з «Мусэдора» і «Ардэна з Фавершэма» былі напісаны менавіта Шэкспірам, пра што сведчаць дадзеныя лінгвістычнага аналізу. Ён мяркуе, што першая п'еса была створана ў 1590 годзе, а праз 20 гадоў прадстаўлена ў новым варыянце выдання з дадаткамі англійскага класіка. У елізавецінскую эпоху п'еса «Мусэдор» была вельмі папулярнай і перавыдавалася 17 разоў; да гэтага даследчыкі меркавалі, што Шэкспір меў да яе толькі ўскоснае дачыненне.

П'еса «Ардэна з Фавершэма» нярэдка прыпісвалася Томасу Кіду, аднак новыя дадзеныя даказваюць, што Шэкспір быў аўтарам цэнтральных сцэнаў твора; астатнія ж сапраўды належаць пяру Кіда. Дарэчы, увесну 2014 года Каралеўская шэкспіраўская таварыства плануе паставіць спектакль па гэтай п'есе, прымеркаваўшы яго да 450-годдзя з дня нараджэння драматурга.

ПОМНІК ЧЫНГІЗУ АЙТМАТАВУ

Да 85-годдзя з дня нараджэння пісьменніка Чынгіза Айтматава ў Маскве ў двары Бібліятэкі замежнай літаратуры імя М. І. Рудаміна быў усталяваны помнік. Аўтар манумента — Георгій Франгулян.


У вітальным слове Палад Бюль-Бюль аглы, народны артыст СССР і пасол Азербайджана ў Расіі, адзначыў, што жыхары Масквы не павінны забываць пра тое, што кіргізы — народ, багаты талентамі, а не толькі працоўныя мігранты, занятыя на нізкааплатных працах.

У гонар гадавіны з дня нараджэння пісьменніка ў Маскве таксама прайшла рэтраспектыва мастацкіх фільмаў па яго творах і выстава фотаработ «Сусветнае гучанне Чынгіза Айтматава».

ПОМНІК БУЛАТУ АКУДЖАВЕ

Ва ўкраінскім горадзе Вілкава Адэскай вобласці, які называюць украінскай Венецыяй, адкрылі першы ў краіне помнік паэту і кампазітару Булату Акуджаве.

Помнік быў усталяваны на галоўным пляцы горада. Цырымонія адкрыцця адбылася ў межах фестывалю «Песня Булата на Дунаі», які праходзіў у Вілкаве. На цырымоніі адкрыцця мэр горада Мікалай Дзядзін адзначыў, што Акуджава бываў у многіх гарадах Украіны, але Вілкава — адзіны горад, памяць пра які паэт увекавечыў у сваіх творах: песні «Дунайская фантазія» і эсэ «Горад на пратоках».



РУКАПІС «ФРАНКЕНШТЭЙНА»

Рукапісы рамана «Франкенштэйн» Мэры Шэлі сталі даступныя ў інтэрнэце. Яны выкладзены на сайце архіва Шэлі-Годвіна.

Задача праекта палягала ў тым, каб папулярызаваць рукапісную спадчыну «першай сям'і ў англійскай літаратуры» XVIII–XIX стагоддзяў: паэта-рамантыка Персі Бішы Шэлі і яго жонкі пісьменніцы Мэры Шэлі (а таксама яе бацькоў — філосафа і раманіста Уільма Годвіна і пісьменніцы-феміністкі Мэры Уолстанкрафт).

Сайт будзе абнаўляцца паступова, аднак адно з цэнтральных месцаў архіва ўжо цяпер займае «Франкенштэйн». Аблічбаваныя ўсе вядомыя рукапісы і чарнавікі, зробленыя Шэлі.

Даследчыкі адзначаюць, што публікацыя рукапісаў «Франкенштэйна» важная, бо дапамагае зразумець працэс працы над творам і ўбачыць, які ўнёсак зрабіў у раман Персі Бішы Шэлі (вядома, што пад яго ўплывам у выніку нарадзілася фінальная версія твора; існуе нават гіпотэза, што менавіта паэт — аўтар рамана).

На сайце можна паглядзець, якія выпраўленні былі зроблены рукой Персі Шэлі, а якія — яго жонкай. Пры гэтым вядома, што ў нейкі момант іх почыркі сталі вельмі падобныя. Даследчыкі адзначаюць, што чыставікі рамана, адрэдагаваныя выдаўцам, былі напісаныя самой пісьменніцай.

Задума «Франкенштэйна» нарадзілася летам 1816 года, калі сям'я Шэлі праводзіла лета ў Жэневе разам з паэтам лордам Байранам. Вядома, што яны вялі гутаркі пра эксперыменты Дарвіна і чыталі аповеды пра прывідаў, створаныя нямецкімі аўтарамі. Па ініцыятыве Байрана кожны з іх напісаў аповед; з гісторыі Мэры Шэлі потым і «вырас» раман «Франкенштэйн, або Сучасны Праметэй». Шэлі працавала над творам разам з мужам у 1816–1817 гадах. У 1818-м яго надрукавалі тыражом у 500 асобнікаў.

Франкенштэйн — цяпер распаўсюджанае пераноснае імя пачвары. Аднак у рамане монстр не меў імя (яго стварыў барон доктар Віктар Франкенштэйн).

ПРЭМІІ

«БУКЕР»-2013

Лаўрэатам Букераўскай прэміі за 2013 год стала пісьменніца з Новай Зеландыі Элеанор Кэтан. Яна ўганараваная прэстыжнай узнагародай за раман «Свяцілы» («The Luminaries»).

832-старонкавая гісторыя пра залатую ліхаманку, што ахапіла свет у XIX стагоддзі, стала самым «доўгім» творам, які атрымліваў прэмію за ўсю яе 45-гадовую гісторыю. «Гэта бліскучая праца. Гэта выдатная праца. Яна аб'ёмная, але не зацягнутая», — так ахарактарызаваў кнігу старшыня журы Роберт Макфарлейн.

Раман Э. Кэтан — гэта дэтэктыў у стылі віктарыянскай эпохі. Характэрная структура твора — кожная новая яго частка ўдвая карацейшая за папярэднюю.

Прэмію пісьменніцы ў Лонданскай ратушы ўручала герцагіня Карнуальская Каміла, жонка спадчынніка брытанскага прынца Чарлза.

Э. Кэтан стала самай маладой уладальніцай гэтай прэстыжнай літаратурнай узнагароды. Ёй 28 гадоў, а свой раман яна завяршыла ў 27.

Летась Букераўскую прэмію атрымала брытанская пісьменніца Хілары Мэнтэл. Яна стала першай жанчынай, каму ўзнагарода прысуджалася двойчы.

Букераўская прэмія заснаваная ў 1968 годзе. Яна прысуджаецца аўтару, які жыве ў адной з краін Садружнасці нацый, Ірландыі або Зімбабвэ, за раман, напісаны на англійскай мове. Пераможца атрымлівае чэк на суму 50 тысячаў фунтаў стэрлінгаў (каля 80 тысячаў даляраў ЗША). Акрамя таго, усім фіналістам, уключаючы пераможцу, уручаецца чэк на 2,5 тыс. фунтаў, а таксама выкананае ўручную падарункавае выданне кнігі.

ПРЭМІЯ ФРАНЦЫІ

Лаўрэатам самай прэстыжнай узнагароды Францыі 2013-га года — Ганкураўскай прэміі (Prix Goncourt) — стаў пісьменнік П'ер Леметр за кнігу «Да сустрэчы наверсе» (Au revoir la-haut).

Ганкураўская прэмія — літаратурная ўзнагарода, якой ужо больш за сто гадоў уганароўваюцца лепшыя раманы на французскай мове. Яна носіць імя французскіх класікаў братоў Ганкураў — Эдмона Луі Антуана і Жуля Альфрэда Юо. Малодшы з іх, Эдмон, па інцыятыве перадаў усю сваю маёмасць літаратурнай Акадэміі, якая пачала называцца Ганкураўскай і заснавала штогадовую аднайменную прэмію.

Прэмія прысуджаецца па выніках галасавання дзесяці членаў Акадэміі на адмысловай сустрэчы ў парыжскім рэстаране «Друан» («Drouant»). Памер Ганкураўскай прэміі складае сімвалічную суму — усяго 10 еўра, затое адкрывае перад лаўрэатам шырокі шлях не толькі да вядомасці і прызнання, але і да гарантавана высокіх тыражоў — і, адпаведна, высокіх ганарараў.

Пры падрыхтоўцы старонкі выкарыстаныя інфармацыя і фотаздымкі The Guardian, novostiliteratury.ru, Odessa Region, prostokniga.com.ua, dw.de, news.tut.by, РИА Новости, AFP, lenta.ru і vsiknygy.net.ua/news.

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by